ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Настаўніцкая газета

Выходзіць з 20 снежня 1945 года

№ 129 (5311)
Субота, 10 лістапада 2001 года
Кошт у розніцу – 83 руб.

Міністр уручыў узнагароды

Напярэдадні другога з'езда настаўнікаў нашай краіны ў Міністэрстве адукацыі адбылося ўручэнне Ганаровых грамат Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і Ганаровых грамат Міністэрства адукацыі лепшым настаўнікам, дэлегатам з'езда.

Гэту пачэсную місію выканаў Міністр адукацыі Пётр Брыгадзін, які асабіста павіншаваў кожнага. У канферэнц-зале сабраліся прадстаўнікі самай важнай прафесіі ў грамадстве з усіх рэгіёнаў краіны. Усяго дваццаць шэсць чалавек, адзінаццаць з якіх былі ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь за заслугі, вялікі асабісты ўклад, шматгадовую плённую працу ў навучанні і выхаванні падрастаючага пакалення. Пятнаццаць настаўнікаў былі ўшанаваны Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі і грашовай прэміяй ў памеры пяці мінімальных заработных плат за шматгадовую плённую і творчую працу ў сістэме адукацыі, за дасягнутыя поспехі ў арганізацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу. Міністр падзякаваў усім за адданасць у сваёй дзейнасці і творчы падыход.

Другая частка цырымоніі прайшла ўжо ў нефармальных абставінах за кубачкам кавы. Настаўнікі мелі магчымасць пагутарыць з Міністрам адукацыі Пятром Брыгадзіным, задаць яму пытанні, якія, дарэчы, пасыпаліся адно за адным. Праблем у нашых педагогаў больш чым дастаткова – вельмі нізкая матэрыяльная база школ, састарэлыя падручнікі, не хапае камп'ютэраў, няма літаратуры па новых тэхналогіях, а таксама і метадычк.

Усе гэтыя праблемы былі вынесены на абмеркаванне ў рамках з'езда. А вось наколькі эфектыўна і канструктыўна вялася гаворка, убачым і адчуем у будучым.

Вольга ДУБОЎСКАЯ.

НА ДЫМКАХ: Міністр адукацыі П.Брыгадзін віншуе лепшых педагогаў краіны; на іх плячах трымаецца ніша школа.

Фота Юрыя БОНДАРАВА.

Юбілеі

Наша здароўе - у іх руках

Свой 80-гадовы юбілей святкуе Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт.

Ён быў народжаны ў нетрах БДУ як першы ў рэспубліцы медыцынскі факультэт. Ужо ў 1925 годзе адбыўся першы выпуск урачоў.

За гэтыя гады ВНУ змяніла некалькі шыльдаў, нязменнай заставалася толькі высокая якасць падрыхтоўкі спецыялістаў. Сёння выпускнікі першай медыцынскай ВНУ працуюць больш чым у 100 краінах свету.

У гэтым годзе Мінскі медінстытут быў пераўтвораны ў Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт і атрымаў статус вядучай вышэйшай навучальнай установы. Дарэчы сказаць, што ён адзіны з ўсіх ВНУ былога Саюза ўвайшоў у Асацыяцыю медыцынскіх школ Еўропы.

Дыплом МДМУ высока цэніцца за мяжой (сёння тут атрымліваюць адукацыю каля 300 студэнтаў з далёкага замежжа). Прэстыжны ён і ў нашым грамадстве. Нягледзячы на невысокую зарплату ўрача, конкурсы пры паступленні ў МДМУ стабільна высокія.

Юбілей універсітэта – гэта не толькі 80 гадоў багатай гісторыі. Гэта – навука, традыцыі, школы... Гэта – людзі, што сваёй працай прынеслі вядомасць універсітэту і краіне. Гэта – наша з вамі здароўе і нашы надзеі...

80 цаглінак у будынку часу

Ураджайная выдалася гэтая восень - юбілейная. Услед за БДУ і Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам свой 80-гадовы юбілей святкуе і Мінскі дзяржаўны архітэктурна-будаўнічы каледж.

Сёння гэта адна з самых прэстыжных сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў краіны. Конкурсы на асобныя спецыяльнасці тут перавышаюць 10 чалавек на месца. І гэта не дзіўна – вучыцца ў каледжы цікава, а на рынку працы яго выпускнікі запатрабаваны заўсёды.

Да свайго 80-годдзя архітэктурна-будаўнічы каледж значна палепшыў матэрыяльную базу. Высокаму ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў садзейнічае і тэхнічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу. Сёння ў каледжы ёсць пяць камп'ютэрных класаў, абсталяваных самай сучаснай тэхнікай. Плануецца і надалей пашыраць камп'ютэрнае забеспячэнне вучэбнага, вытворча-гаспадарчага і кіраўнічага працэсаў.

Зроблены важны крок на шляху інтэграцыі сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. Каледж мае дамоўленасць з Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміяй аб дзвюхступеннай сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў. У гэтай сувязі перагледжаны вучэбныя праграмы па асноўных дысцыплінах, што дазваляе лепшым выпускнікам каледжа паступаць у БДПА на скарочаны тэрмін навучання.

За 80 гадоў Мінскі дзяржаўны архітэктурна-будаўнічы каледж падрыхтаваў каля 25 тысяч спецыялістаў. Яго выпускнікі розных гадоў зрабілі значны ўнёсак у праектаванне і будаўніцтва такіх буйных збудаванняў нашага часу, як Палац Рэспублікі, аўтавакзал "Маскоўскі" і новы будынак чыгуначнага вакзала ў Мінску, Палац спорту ў Віцебску, лядовыя палацы ў Мінску, Гродна, Гомелі.

Каледж ганарыцца сваімі выпускнікамі, якіх навучыў ён ствараць камфорт і прыгажосць. Але тут упэўнены – найпрыгажэйшыя дамы і палацы яшчэ будуць пабудаваны наступнымі выпускнікамі.

Галіна СІДАРОВІЧ.

Паважаныя чытачы!

Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 2002 года.

Падпісацца на "Настаўніцкую газету" можна ў любым паштовым аддзяленні ці ў агенцтве "Белсаюздруку".

Падпісны кошт на паўгоддзе для індывідуальных падпісчыкаў – 8400 рублёў; на квартал – 4200 рублёў; на месяц – 1400 рублёў.

Па ведамаснай падпісцы: на паўгоддзе – 22800 рублёў; на квартал – 11400 рублёў; на месяц – 3800 рублёў.

З выступленняў дэлегатаў II з'езда настаўнікаў

Аляксандр РАДЗЬКОЎ, рэктар Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта:

— Форум настаўнікаў такога ўзроўню – гэта магчымасць ацаніць зробленае, абмеркаваць праблемы і, галоўнае, намеціць шляхі іх вырашэння.

Хачу выдзеліць і прапанаваць увазе дэлегатаў з'езда тры з іх.

Першая праблема – як забяспечыць кваліфікаванымі педагагічнымі кадрамі ўсе рэгіёны рэспублікі? Для гэтага трэба захаваць і ўдасканаліць мэтавы прыём выпускнікоў сельскіх школ у педагагічныя ВНУ. У апошнія гады мы змаглі пераканацца, што паспяховасць абітурыентаў, прынятых па мэтавых накіраваннях, ужо праз год вышэйшая, чым сярэдняя па універсітэту. І практычна ўсе яны вяртаюцца на працу ў родныя мясціны, замацоўваючыся там.

Трэба пакінуць і абавязковае размеркаванне для студэнтаў, якія вучацца на бюджэтнай аснове. Дзяржаўныя грошы трэба берагчы. Гэта выхоўвае адказнасць перад грамадствам. І студэнты ўспрымаюць дзяржаўнае размеркаванне нармальна. У апошнія гады нават выпускнікі, якія вучацца за свой кошт, часта прэтэндуюць на працоўныя месцы, што прапануюцца дзяржавай.

Трэба захаваць наяўную сістэму дзяржаўнага і грамадскага кантролю за ходам уступных экзаменаў у ВНУ, бо пры гэтым ажыццяўляецца адкрытая, мэтанакіраваная, сумесная работа дзяржаўнай камісіі і прыёмнай камісіі ВНУ па стварэнні ўмоў для аб'ектыўнай ацэнкі ведаў абітурыентаў, адбору ў ВНУ найбольш падрыхтаваных і дастойных.

Комплекс захадаў па забеспячэнні педагагічнымі кадрамі рэгіёнаў павінен прадугледжваць сістэму работы па замацаванні маладых спецыялістаў на месцах. Спецыяліст застанецца працаваць па месцы размеркавання, калі ў яго будзе там жыллё, добры заробак, арганізавана сацыяльна-культурная сфера.

Калі сумеснымі намаганнямі ВНУ і органаў мясцовай улады мы будзем выхоўваць адказнасць маладога чалавека перад грамадствам і дапаможам яму стварыць умовы для нармальнага жыцця – мы вырашым кадравую праблему.

Другая праблема – як дабіцца, каб рэгіянальныя класічныя універсітэты сталі пасапраўднаму навуковымі, адукацыйнымі і культурнымі цэнтрамі?

Для гэтага трэба пашырыць уплыў універсітэта на ўсю сістэму адукацыі. Лепш за ўсё гэта зрабіць праз стварэнне вучэбнага комплексу на базе універсітэта, уключыўшы ў яго хоць бы па адной навучальнай установе ўсіх асноўных тыпаў (школа, гімназія, ліцэй, каледж і інш.). Гэта дазволіць прадметна ўздзейнічаць на развіццё ўсёй рэгіянальнай сістэмы адукацыі. Мы гэта робім і бачым вынікі.

Трэба дабівацца адкрытасці дзейнасці універсітэтаў, прапагандаваць і ўкараняць на прадпрыемствах рознага тыпу стыль, метады, культуру работы ВНУ. Адзін з метадаў дасягнення такой адкрытасці – творчыя сустрэчы калектываў універсітэтаў і буйных прамысловых прадпрыемстваў. У нас ёсць вопыт такой работы з магілёўскімі заводамі. Карысць – узаемная.

Надзвычай неабходна скіраванасць навуковага патэнцыялу універсітэта на вырашэнне рэгіянальных задач (эканамічных, тэхналагічных, сацыякультурных). Навука павінна працаваць на канкрэтны вынік. А ён найбольш адчувальны і каштоўны на месцы, у рэгіёне.

Роля рэгіянальных класічных універсітэтаў павінна быць зафіксавана на дзяржаўным узроўні, у выглядзе дзяржаўнай праграмы іх развіцця.

Трэцяя праблема – яна ў большай ступені настаўніцкая.

Можна доўга і прыгожа разважаць пра тэхналогіі навучання, сучасныя методыкі выкладання і нават прымяняць іх на практыцы. Але калі пры гэтым не ведаць сам прадмет – эфект будзе нават не нулявым, а адмоўным. Прадметная падрыхтоўка настаўніка – важная частка яго прафесійнага майстэрства.

Чаму вучыць? Гэтую праблему мы павінны вырашаць разам і на дзяржаўным узроўні, бо яна шматгранная, няпростая і вельмі дынамічная. Пэўны вопыт тут ужо ёсць. Але важна, каб гэтая праблема не засталася па-за ўвагай.

Раман ТАРАСЕВІЧ, загадчык Глыбоцкага раённага аддзела адукацыі:

— Асаблівую надзённасць і сваё значэнне набывае рэформа агульнаадукацыйнай школы ў сельскіх рэгіёнах. На першым плане стаіць праблема падрыхтоўкі і замацавання кваліфікаваных кадраў. І сістэма адукацыі павінна ўнесці ў яе вырашэнне належны ўклад. Відавочна, што прыярытэты сельскага жыхара мяняюцца ў бок павышэння якасці адукацыі. Сёння з упэўненасцю можна казаць, што практычна кожная вясковая сям'я хоча, каб дзіця мела глыбокія веды.

Першыя вынікі рэформы дазваляюць гаварыць пра пазітыўны характар у цэлым яе ідэі знаходзяць падтрымку сярод педагогаў, бацькоў, грамадскасці. І гэта, бадай што, галоўнае. Але разам з тым у працэсе рэалізацыі на практыцы прыйшло разуменне таго, што нельга дасягнуць асноўнай мэты рэформы – забеспячэння сродкамі дыферэнцыяцыі адукацыйных патрэб кожнага навучэнца – без істотных змяненняў у традыцыйных падыходах да арганізацыі адукацыі на сяле. Відавочна, што шляхі рэалізацыі дыферэнцыяцыі навучальнага працэсу, якая паспяхова вядзецца ў гарадскіх і пасялковых школах, не заўсёды прымальныя для малакамплектных школ, якія складаюць асноўную частку агульных адукацыйных усноў сельскай мясцовасці. Гэта абумоўлена уніфікаваным нарматыўна-прававым суправаджэннем, недаканалай матэрыяльна-тэхнічнай базай, недастатковым кадравым забеспячэннем.

У 1995 годзе па ініцыятыве Міністэрства адукацыі ў нашым раёне, у якім каля 30 малакамплектных школ, пачаўся эксперымент па арганізацыі дыферэнцыраванага навучання. Перад усёй адукацыйнымі структурамі раёна была пастаўлена задача распрацоўкі і эксперыментальнай праверкі адукацыйных тэхналогій, якія дазволілі б кожнаму школьніку мець магчымасць вывучэння на павышаным узроўні патрэбных яму прадметаў навучальнага плана. Арганізацыйнай асновай гэтага эксперыменту паслужла прынятае Міністэрствам адукацыі ў 1994 годзе рашэнне аб увядзенні 2 гадзін у навучальны план сельск малакамплектных школ. Іменна гэтыя 2 гадзіны і дазволілі ў старэйшых класах размеркаваць вучняў з рознымі адукацыйнымі запатрабаваннямі.

Не спыняючыся на іх арганізацыйных і тэхналагічных аспектах працэсу эксперыменту, засяроджу вашу ўвагу на яго выніках

Сёння большасць сярэдніх і базавых школ раёна забяспечваюць выкладанне асноўных прадметаў навучальнага плана суадносна з адукацыйнымі запатрабаваннямі вучняў. Павышы ці паглыблены ўзровень навучання рэалізуецца праз адпаведныя формы арганізацыі навучальнага працэсу, адэкватны выбар педагагічных тэхналогій, падмацоўваецца кваліфікацыяй педагога і ў асноўным дастатковай матэрыяльнай базай.

Нельга не сказаць яшчэ і пра другі відавочны вынік эксперыменту. Узаемадзянне з навукоўцамі, бесперапыннае авалоданне больш высокім узроўнем выкладання прадметаў, асвоенне і рэалізацыя новых тэхналогій, зладжанасць і маштабнасць дзейнасці метадычных службаў раённых школ – усё гэта станоўча паўплывае на павышэнне педагагічнага майстэрства, кваліфікацыі настаўнікаў кіраўнікоў школ.

У раёне створана дыферэнцыраваная асобаснаарыентаваная сістэма выхаваўчай работы, накіраваная на гуманістычнае фарміраванне і развіццё асобы вучня, яго псіхалагічную і сацыяльную адаптацыю ў грамадстве. Гэта сістэма дапамагала дамінуючай у дзейнасці ўсіх адукацыйных структур раёна. Такім чынам, дасягнута гарманічнае ўзаемадзеянне трох складнікаў навучальнага працэсу: навучання, развіцця і выхавання дзяцей і падлеткаў.

Эфектыўнасць прынятай намі схемы арганізацыі дыферэнцыраванага навучання можна пацвердзіць лічбамі. Так, у 2001 годзе з выпускнікоў школ (школ, якія працуюць па сістэме профільнай дыферэнцыяцыі) 75 працэнтаў – трое з чатырох вучняў – паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, ёсць пераможцы абласных і рэспубліканскіх алімпіяд. Здавалася б, гэта чыста адукацыйны фат, але ён дае значны сацыяльны эфект. У сваім раёне мы не маем дыфіцыту кадраў па многіх спецыяльнасцях.

Думаю, што напраўданы намі вопыт можа быць улічаны пры распрацоўцы мадэляў рэалізацыі рэформы ва ўмовах сельскай мясцовасці.

Валянціна ЛУКІНА, выкладчык сацыяльна-гуманітарных дысцыплін Мінскага дзяржаўнага педагагічнага каледжа № 2 імя М.Танка:

— Педагагічная сярэдняя спецыяльная адукацыя сёння з'яўляецца самастойным значным звяном у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў для ўстаноў адукацыі рэспублікі.

Аднак Нацыянальная праграма вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыі Рэспублікі Беларусь прадугледжвае "...паступовае зліццё сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай педагагічнай адукацыі". Калі гэтае палажэнне рэалізуецца, з сістэмы педагагічнай адукацыі знікне значная структура.

Паводле даных статыстыкі, кожны трэці настаўнік і выхавальнік рэспублікі – выпускнік педагагічных вучылішчаў і каледжаў.

Як паказвае практыка, аўтарытэт педагагічнай сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы ва ўсіх рэгіёнах Рэспублікі Беларусь – высокі: конкурс абітурыентаў на месца 3–4 чалавекі.

Спецыялісты, падрыхтаваныя ў педагагічных каледжах, не менш канкурэнтаздольныя і запатрабаваныя, чым выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў. Пра гэта сведчыць 100-працэнтнае размеркаванне выпускнікоў, напрыклад, у нашым Мінскім дзяржаўным педагагічным каледжы № 2 імя Максіма Танка.

Сёння ў большасці выпадкаў выпускнікі педагагічных ВНУ рэальна авалодваюць прафесіяй толькі ў працэсе работы ў адукацыйных установах. У нас жа 40 працэнтаў вучэбнага працэсу – практыка, якая носіць бесперапынны характар і ўяўляе сабой цэласны працэс авалодання прафесійнымі ўменнямі і навыкамі, пачынаючы з 2-га курса і да канца вучобы.

Працэс навучання – індывідуалізаваны. Ён базіруецца на новых педагагічных тэхналогіях, нетрадыцыйных формах правядзення заняткаў, разнастайных відах самастойнай работы.

Пра высокую якасць выкладання сведчаць вынікі дзяржаўных экзаменаў. Напрыклад, у нашым каледжы сёлета з 208 выпускнікоў 78 скончылі з "чырвонымі" дыпломамі, 124 працягваюць навучанне ў ВНУ.

Нашы педагогі – перш за ўсё практыкі. Але вымушаны быць і вучонымі, і метадыстамі. Менавіта яны забяспечваюць дынамічнасць працэсу ўкаранення новых адукацыйных тэхналогій.

Выкладчыкі вымушаны ствараць сучасныя вучэбна-метадычныя дапаможнікі, распрацоўваць новыя праграмы. І ўсё гэта – за кошт свайго ўласнага часу. Гэтая вялікая метадычная работа не ўключаецца ў тарыфікацыю і ніяк не аплачваецца, як, напрыклад, у ВНУ.

Даўно наспела неабходнасць удасканаліць навукова-метадычную службу ў педагагічных каледжах, перагледзець штатны расклад з улікам змянення навукаёмістасці вучэбнага працэсу, распаўсюдзіць сацыяльныя льготы на выкладчыкаў сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

У выніку педагагічнага супрацоўніцтва студэнтаў і выкладчыкаў мы маем выпускніка-прафесіянала, падрыхтаванага да педагагічнай дзейнасці. Агульнаадукацыйная школа перыяду яе рэфармавання патрабуе спецыяліста такога ўзроўню і якасці, якога мы рыхтуем.

У сувязі з гэтым неабходна разглядаць сярэднюю спецыяльную педагагічную адукацыю як культурна-каштоўнасную і неабходную галіну адукацыі, што склалася гістарычна і мабільна вырашае задачы падрыхтоўкі спецыялістаў на рэгіянальным узроўні.

Памяці педагога і чалавека

У БДПУ імя М.Танка стала традыцыяй знаёміць будучых настаўнікаў з дзейнасцю і работамі вучоных, якія працуюць або працавалі ў гэтай навучальнай установе.

Імя прафесара кафедры педагогікі Грымаця Адама Антонавіча вядома не толькі студэнтам і выкладчыкам універсітэта, але і ўсёй педагагічнай грамадскасці Беларусі. Яго ідэі, думкі, кнігі шырока выкарыстоўваюцца студэнтамі, маладымі навукоўцамі, настаўнікамі-практыкамі.

Выхад у свет апошняй манаграфіі вучонага "Фарміраванне маральных ідэалаў школьнікаў" можна лічыць сапраўдным педагагічным подзвігам. Яна – вынік шматгадовай плённай працы. Перш чым кніга пабачыла свет, Адам Антонавіч апублікаваў на згаданую тэму 55 артыкулаў у рэспубліканскіх газетах і часопісах.

У БДПУ імя М.Танка адбылася прэс-канферэнцыя па кнізе А.А.Грымаця "Фарміраванне маральных ідэалаў школьнікаў", прысвечаная памяці педагога.

Пра таленавітага вучонага падзяліліся ўспамінамі прарэктар па вучэбнай рабоце і міжнародных сувязях В.І.Талкачоў, загадчык кафедры педагогікі прафесар І.І.Цыркун, выкладчыкі кафедры педагогікі, аспіранты А.А.Грымаця. У сваіх выступленнях яны падкрэслілі, што таленавіты вучоны ўнёс вялікі ўклад у развіццё беларускай педагагічнай навукі, шмат зрабіў для БДПУ імя Максіма Танка.

Імя Адама Антонавіча Грымаця вядома не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. Яго пяру належыць шмат манаграфій, падручнікаў, звыш чым 200 артыкулаў, якія выдадзены на некалькіх мовах.

Навуковец заснаваў сваю школу. Толькі за апошнія 10 гадоў пад яго кіраўніцтвам было абаронена 20 кандыдацкіх дысертацый. Выхаванцы Адама Антонавіча працуюць у розных ВНУ краіны, навучальных установах Германіі, Польшчы, Кубы.

А.А.Грымаць развіваў ідэі нацыянальнай педагогікі, займаўся праблемамі фарміравання маральных каштоўнасных арыентацый моладзі, меў шматгранныя сувязі з навукоўцамі бліжэйшага замежжа.

Прысутныя адзначылі, што А. А. Грымаць быў цудоўным чалавекам. Непасрэдны, адкрыты, ён не хваляваўся пра ўзнагароды і званне. Сціплы, з развітым пачуццём гонару, таленавіты вучоны спадзяваўся толькі на сваю працавітасць, веды і здольнасці. Канкрэтнымі справамі і мудрымі словамі ён выкладаў самую важную і самую цяжкую ў свеце навуку – быць Чалавекам.

Студэнтам універсітэта прадставілася магчымасць пазнаёміцца з асноўнымі навуковымі працамі Адама Антонавіча Грымаця. Для будучых настаўнікаў супрацоўнікі бібліятэкі падрыхтавалі выстаўку кніг.

З асаблівай цеплынёй сустрэлі прысутныя жонку навукоўца Соф'ю Аляксееўну. Яна пазнаёміла студэнтаў з жыццёвым шляхам А.А.Грымаця і падкрэсліла, што Адам Антонавіч вельмі любіў сваю Беларусь, яе народ, родную мову, а таму і жыццё ён прысвяціў выхаванню сапраўдных грамадзян краіны.

Свае думкі пра апошнюю кнігу А.А.Грымаця выказалі студэнты К.Цішкевіч, В.Шкутко, С.Бокач, Ю.Халімоненка, С.Помазаў, Л.Нікалаюк, А.Каначук, А.Блінкова. Яны падкрэслілі, што ў сваёй манаграфіі аўтар разглядае не толькі тэарэтычныя аспекты праблемы фарміравання маральных ідэалаў моладзі, але і робіць спробу раскрыць найбольш рацыянальныя шляхі іх стварэння ў сучасных вучняў, распрацаваць сістэму вучэбна-выхаваўчай працы школы.

Акадэмік І.І.Цыркун у заключным слове адзначыў, што вучоны, член-карэспандэнт Акадэміі акмеалагічных навук і Беларускай акадэміі адукацыі, прафесар кафедры педагогікі БГПУ імя М.Танка Адам Антонавіч Грымаць назаўсёды застанецца ва ўдзячнай памяці сваіх калег і вучняў.

Лідзія КАЗІНЕЦ, дацэнт кафедры педагогікі БДПУ імя М.Танка.

НП РУП "Прогресс"

изготавливает школьную, столовую мебель, компьютерные столы для учебных заведений.

Производим ремонт учебной мебели.

Изготавливаем средства малой механизации: тележки, решетки, ограждения, металлоконструкции под заказ.

Тел. 254-20-08; 286-19-62; 254-32-66.

Акадэмія паслядыпломнай адукацыі паведамляе

аб тым, што з 03.12.2001 г. па 07.12.2001 г. адбудуцца аўтарскія курсы па сістэме Л.У.Занкова (першы год навучання).

Навучанне бясплатнае.

Пражыванне іншагародніх у гасцініцах г.Мінска (кошт ад 5000 руб. да 10000 руб. у суткі).

Уб удзеле ў курсах просьба паведаміць да 15.11.2001 г.

Даведкі па тэлефоне: 285 78 55

Мэта 12-гадовай школы – павышэнне якасці навучання

Барыс КРАЙКО, дырэктар Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі:

— На першым з'ездзе настаўнікаў Рэспублікі Беларусь было вызначана, што асноўнай функцыяй школы з'яўляецца дзейнасць па фарміраванні якасцей, якія маюць індывідуальную і сацыяльна арыентаваную вартасць для асобы. Быў прызнаны неабходным пераход у школах Беларусі ад уніфікаванай да асобасна арыентаванай адукацыі. У структурных адносінах меркавалася стварэнне ступеньчатай сістэмы адукацыі, з разнастайнымі тыпамі ўстаноў, спалучаных у дынамічную структуру з прадуманымі сувязямі.

У адпаведнасці з гэтым планавалася правядзенне карэкцыі зместу адукацыі, якое дыктавалася трыма сур'ёзнымі супярэчаннямі:

– паміж структурай, зместам адукацыі і рэальным жыццём;

– паміж навуковасцю зместу і яго даступнасцю па ўзроставых этапах;

– паміж аб'ёмам зместу адукацыі і вучэбным часам, які выдзяляецца для яго засваення.

Ішла размова і пра тэхналогіі навучання, якія неабходна пабудаваць з пазіцыі актывізацыі самастойнага пошуку вучнямі адказаў на пастаўленыя пытанні і ажыццяўлення дыферэнцыраванага навучання.

Асноўнымі прынцыпамі пабудовы структуры і зместу адукацыі вызначаліся наступныя:

– фундаментальнасць у спалучэнні з даступнасцю;

– выхаваўчае ўздзеянне;

– арыентаванасць на засваенне нацыянальнай культуры ў адзінстве з агульначалавечымі каштоўнасцямі;

– дыферэнцыраванасць;

– развіццё мыслення навучэнцаў.

Былі вызначаны асноўныя якасныя патрабаванні да зместу адукацыі.

Першае – стварыць для вучняў магчымасць атрымаць несупярэчныя адказы на тры пытанні: што такое свет, што такое чалавек і хто "я" як чалавек у гэтым свеце. Бо без адказу на гэтыя пытанні асэнсаваны ўдзел асобы ў развіцці грамадства абмежаваны.

Другое – навучыць жыць разам у чалавечай супольнасці, развіваючы веды аб усіх народах, іх гісторыі, традыцыях, звычках, ладзе мыслення.

Трэцяе – сфарміраваць уменне набываць веды, навучыць самастойна працаваць, каб арыентавацца ў прасторы і часе ў век глабальнай інфарматызацыі, з узмацненнем асабістай адказнасці ў рамках калектыўнай дзейнасці.

Такія задачы былі пастаўлены перад сістэмай у сувязі з тым, што ўдасканаленне школы на старой, інфармацыйнай парадыгме не прыводзіла да станоўчых вынікаў і не змяняла тэндэнцыі, калі вучні пры ўсе большым павелічэнні аб'ёму прапаноўваемых у школе ведаў усё менш ведаюць і ўсё горш карыстаюцца сваімі ведамі на практыцы.

Якія крокі зроблены нашай краінай у перыяд паміж першым і другім з'ездамі настаўнікаў у вырашэнні пастаўленых задач?

За гэты час створаны і прайшлі дзяржаўную рэгістрацыю адукацыйныя стандарты для школы і рыхтуюцца праекты рознаўзроўневых стандартаў па ступенях навучання і накірунках профільнай дыферэнцыяцыі.

Пры гэтым адзначу, што на базе стандартаў могуць распрацоўвацца розныя варыянты вучэбных праграм, падручнікаў і дапаможнікаў. Але ўсе яны павінны забяспечваць засваенне ўстаноўленых патрабаванняў да ўзроўняў падрыхтоўкі навучэнцаў.

Галоўнай састаўной часткай адукацыйных стандартаў з'яўляюцца асноўныя палажэнні аб структуры базіснага вучэбнага плана для 12-гадовай школы.

Раздзяленне вучэбнага плана на дзяржаўны і школьны кампаненты стварае падставу для рэалізацыі аднаго з вядучых прынцыпаў пабудовы структуры і зместу адукацыі ў 12-гадовай школе – варыятыўнасці і рознаўзроўневасці навучання пры ўмове, што абавязковая нагрузка на вучня не будзе перавышаць максімальна дапушчальнай. Базісны вучэбны план дазваляе рэалізаваць адно з асноўных палажэнняў рэформы агульнаадукацыйнай школы – ліквідацыю вучэбнай перагрузкі, захаванне і ўмацаванне здароўя школьнікаў. Такая пазіцыя з'яўляецца адной з важных тэндэнцый у фарміраванні школьнага зместу адукацыі.

Азначанае дасягаецца праз памяншэнне максімальнай агульнай тыднёвай нагрузкі вучняў на 1–3 – у пачатковай, 5 – у базавай, 4–6 гадзін у агульнаадукацыйнай школе ў параўнанні з вучэбнымі планамі 11-гадовай школы 90-х гадоў, а таксама памяншэнне працягласці рабочага тыдня вучняў да пяці дзён, што стварае магчымасць паўнавартаснага адпачынку вучняў за выхадныя дні. Шосты дзень школьнага тыдня можна выкарыстоўваць для заняткаў па інтарэсах. Гэты дзень можа быць як суботай, так і любым іншым днём.

Увядзенне ў вучэбны план трох гадзін фізічнай культуры – таксама адзін з крокаў для захавання здароўя школьнікаў.

Акрамя гэтага, зроблена спроба ўраўнаважыць тры адукацыйныя блокі – веды па асновах навук, цыкл мастацка-эстэтычных дысцыплін і раскрыццё паняццяў аб каштоўнасных арыентацыях. Гэта забяспечваецца больш аптымальнымі, на наш погляд, суадносінамі ў вучэбным плане прыродазнаўча-матэматычнага і гуманітарнага цыклаў прадметаў.

У структуру вучэбнага плана на старшай ступені навучання закладзена ідэя многапрофільнасці навучання. Розныя тыпы навучальных устаноў, якія існуюць у цяперашні час, дапаўняюцца агульнаадукацыйнымі школамі з профільнымі ліцэйскімі класамі агульнаадукацыйнага, прыродазнаўча-матэматычнага, гуманітарнага і тэхналагічнага напрамкаў дыферэнцыяцыі.

Вядома, што вучням, якія паглыблена вывучаюць літаратуру, мэтазгодна вывучаць, напрыклад, матэматыку ў старэйшых класах менш, чым тым, хто займаецца па прыродазнаўча-матэматычным профілі, але ўсе яны павінны авалодаць інварыянтным узроўнем.

Таму мы пайшлі па шляху вызначэння і падрыхтоўкі як інварыянтнага, так і варыятыўнага навучальна-метадычнага забеспячэння для кожнага з профіляў навучання. Гэта дазваляе аптымізаваць нагрузку вучняў на ўзроўні вучэбных планаў і праграм.

Такім чынам, структура вучэбнага плана агульнаадукацыйнай школы стала дастаткова дынамічнай і варыятыўнай, накіраванай на забеспячэнне інтарэсаў і здольнасцей вучняў, на стварэнне спрыяльных умоў для іх развіцця і рэалізацыі жыццёвых планаў.

Адной з вельмі важных задач, якія вырашаліся паміж з'ездамі, з'яўлялася падрыхтоўка новага вучэбна-метадычнага забеспячэння для 12-гадовай школы.

Між тым, калі мы выйшлі на этап канкрэтных школьных пераўтварэнняў, сталі больш яскрава выяўляцца і надзённыя праблемы.

Узнікла сур'ёзная супярэчнасць паміж імклівым развіццём аб'ёму інфармацыі, магчымасцямі яе засваення за вызначаны прамежак часу і неабходнасцю захавання асноўных элементаў фундаментальных ведаў у школе. Асновы навук не з'яўляюцца сёння адзінай крыніцай фарміравання зместу адукацыі. Таму прынцып непарыўнага следавання зместу школьных прадметаў за дасягненнямі навукі, які да цяперашняга часу быў асноўным, не адпавядае сацыяльнай функцыі школы, бо не супадае з сацыяльнай функцыяй навукі.

Ва ўзнікшай сітуацыі праблема заключаецца менавіта ў дыдактычным канструяванні вучэбнага прадмета, а не ў адаптацыі ведаў "базавай навукі" да школьных патрэб.

Гэта пазіцыя вельмі важная, бо ў змесце адукацыі яшчэ застаўся акцэнт на інфарматыўным кампаненце навучання – ведах. Мноства зместавага матэрыялу па прадметах засланяе найбольш істотнае для агульнай адукацыі, для фарміравання светапогляду асобы.

Стала зразумелым, што традыцыйнае ўдасканаленне зместу школьнай адукацыі ўслед за накапленнем новых ведаў у розных галінах навукі непазбежна цягне за сабой увядзенне новага матэрыялу, а гэта азначае жывучасць перагрузкі вучняў школьнымі ведамі. У гэтай сітуацыі вызначэнне аптымальнага зместу з'яўляецца архіважнай і складанай задачай.

Пры гэтым аказалася відавочным, што выключна экспертныя ацэнкі аднаго-двух рэцэнзентаў не могуць быць асноўнай падставай для ўвядзення вучэбна-метадычных комплексаў (ВМК) у масавую школу. Яны павінны спалучацца з аб'ектыўнымі колькаснымі метадамі і паказчыкамі, якія адлюстроўваюць сацыяльныя запыты па тым ці іншым вучэбным курсе, прадмеце. Такое змяненне працэдуры канструявання зместу ВМК дазволіла па-новаму падысці да рашэння праблемы распрацоўкі зместу адукацыі.

У адпаведнасці з такой пазіцыяй створана сістэма падрыхтоўкі і эксперыментальнай апрабацыі ВМК.

З мэтай падрыхтоўкі ВМК у адпаведнасці з псіхолага-фізіялагічнымі асаблівасцямі вучняў праводзіцца іх эксперыментальная праверка ў 19 школах рэспублікі перад тым, як яны трапяць у масавую практыку. Аналагаў такой дзейнасці няма ў краінах СНД.

Для яе каардынацыі і аказання дапамогі аўтарам падручнікаў і эксперыментальным школам у інстытуце створаны адпаведны аддзел, у функцыі якога ўваходзіць забеспячэнне неабходнага ўзаемадзеяння паміж эксперыментальнымі школамі, аўтарскімі калектывамі і кіраўнічымі структурамі ў адукацыі.

Далейшы лёс падручніка, яго якасць залежаць ад умення і жадання аўтара ўлічыць выказаныя заўвагі. Адной з праблем тут з'яўляецца павышэнне кваліфікацыі аўтарскіх калектываў. Таму, на наш погляд, неабходна пабудова сістэмы псіхалагічнай і дыдактыка-метадычнай падрыхтоўкі аўтараў, вырошчванне аўтарскіх школ. Гэтую функцыю мог бы ўзяць на сябе Нацыянальны інстытут адукацыі пры пэўных змяненнях статусу і структуры. На жаль, сёння ідзе адваротны працэс. Сродкаў на правядзенне далейшай эксперыментальнай апрабацыі падручнікаў не выдзелена.

Што да выніковасці праведзенай працы, то варта гэта адзначыць. Падрыхтаваны эксперыментальныя вучэбна-метадычныя комплексы па ўсіх прадметах вучэбнага плана з 4 па 7 класы па нумарацыі дванаццацігадовай школы, якія ўключаюць: падручнік, метадычны дапаможнік для настаўніка, сшытак альбо дыдактычныя матэрыялы для вучняў, хрэстаматыі. Агульная колькасць падрыхтаваных матэрыялаў – каля 400 найменняў.

Акрамя гэтага, падрыхтаваны больш за 50 найменняў матэрыялаў для дзяцей з асаблівасцямі развіцця ў галіне спецыяльнай адукацыі, у тым ліку і адукацыйныя стандарты. Некаторыя з падрыхтаваных падручнікаў для такіх вучняў сталі лаўрэатамі міжнародных конкурсаў па ўзроўню сваёй метадычнай дасканаласці.

Але ў сувязі з такой вялікай колькасцю падрыхтаваных матэрыялаў узнікае праблема іх выдання для карыстання ў масавай практыцы, бо дзяржаўныя сродкі ў цяперашні час выдзяляюцца пераважна на падручнікі. А што рабіць з астатнімі матэрыяламі?

Агульныя вынікі эксперыментальнай працы дазваляюць канстатаваць: у асноўным назіраецца павышэнне ўзроўню паспяховасці навучання школьнікаў; па-другое, дзецям, а гэта сцвярджаюць і бацькі і настаўнікі, стала больш цікава вучыцца, і яны менш стамляюцца; па-трэцяе у вучняў з'явілася больш магчымасці займацца па інтарэсах у сувязі з пяцідзённым вучэбным тыднем.

Але ёсць пытанні па аб'ёму і складанасці зместу адукацыі па частцы вучэбных курсаў, асабліва ў пачатковай школе. Ідзе праца па давядзенні іх зместу да псіхафізіялагічных магчымасцей вучняў. Ужо падрыхтаваны прынцыпова новы падручнік па курсу "Мая Радзіма Беларусь", перапрацоўваюцца падручнікі па беларускай і рускай мовах для падрыхтоўчага і пачатковых класаў.

Вялікую ролю ў павышэнні якасці адукацыі маюць тэхналогіі адукацыі. За пройдзены пасля першага з'езда час зроблены пэўныя крокі ў асэнсаванні самога паняцця "тэхналогіі", іх тыпалагізацыі і эксперыментальнай праверцы.

Вядзецца актыўная праца па аналізу і ўкараненні найбольш эфектыўных тэхналогій з пазіцыі засваення зместу адукацыі і развіцця здольнасцей вучняў, якая ў навуковым плане курыруецца Нацыянальным інстытутам адукацыі.

Ёсць тут і праблема. Часам за формай, за сюжэтным бокам той альбо іншай тэхналогіі забываецца мэта самога працэсу навучання. У выніку маем з'явы, калі на ўроку вучні адпрацоўваюць сюжэтна-ролевыя гульні, а засваенне зместу ажыццяўляюць дома. Гэта значна павялічвае нагрузку на дзяцей.

Якія асноўныя напрамкі дзейнасці плануецца ажыццявіць у галіне распрацоўкі структуры, зместу і тэхналогій адукацыі і выхавання ў перспекыве? Да іх мы адносім:

– распрацоўку стандартаў, праграм і зместу адзіных рознаўзроўневых падручнікаў для базавага і паглыбленага напрамкаў вывучэння матэрыялу, а таксама вучэбна-метадычных комплексаў па ўсіх прадметах для паглыбленага навучання як асобнай адукацыйнай мадэлі;

– распрацоўку навукова абгрунтаванага пераліку вучэбных курсаў, практыкумаў і прадметаў па выбары і іх адпаведнага вучэбна-метадычнага забеспячэння;

– далейшую аналітычную працу па вызначэнні найбольш эфектыўных тэхналогій для адукацыйнага і выхаваўчага працэсу ў гарадской і сельскай школах і ўкараненне іх у масавую практыку.

Падрыхтоўку рознаўзроўневых вучэбна-метадычных комплексаў плануецца ажыццяўляць на падставе наступных асноўных прынцыпаў: фундаментальнасці, непарыўнасці і пераемнасці адукацыі для ўсіх напрамкаў профільнай дыферэнцыяцыі; узгодненасці падыходаў і адукацыйных стандартаў у кантэксце стварэння адзінай адукацыйнай прасторы Саюза Беларусі і Расіі, краін СНД і Еўрапейскіх супольнасцяў.

Перад сістэмай адукацыі і яе кіраўніцтвам заўсёды стаяць як мінімум дзве задачы: забяспечыць жыццяздольнасць адукацыйнай сістэмы і стварыць умовы для яе развіцця. Гэта дасягаецца агульнымі намаганнямі Урада, Міністэрства адукацыі, мясцовых улад пад кіраўніцтвам і пры непасрэднай падтрымцы Прэзідэнта нашай краіны. Наша агульнаадукацыйная школа, як састаўная частка ўсёй сістэмы адукацыі, пры пэўнай падтрымцы будзе і надалей плённа працаваць і развівацца, уносячы важкі ўклад у развіццё краіны.

К нам обращаются за помощью и защитой

Тамара ЧЕБОТОВА, прадседатель Белорусского профсоюза работников образования и науки:

— Уважаемые делегаты и гости съезда, дорогие коллеги!

Думаю, многие из Вас, присутствующие на сегодняшнем педагогическом форуме, помнят приподнятую и полную надежд атмосферу I съезда учителей Беларуси. Ведь именно на нем, по сути, был дан старт школьной реформе, которую поддержало и одобрило учительство страны.

Было ясное понимание, что в XXI век молодое суверенное государство должно войти с обновленной системой образования. И верилось, что в начале третьего тысячелетия школа и ее ключевая фигура – учитель – непременно займут главенствующее место в системе приоритетов страны. Уверенность подкреплялась памятным заявлением, сделанным с трибуны съезда Президентом:

"Пусть эти годы, – сказал он, – станут временем коренного перелома в отношении нашего общества к Учителю!". Глава государства пообещал сделать все для создания педагогам максимально благоприятных условий для работы. Вселяла оптимизм и государственная программа "Учитель", разработанная по поручению Президента буквально по горячим "следам" съезда уже в феврале 1998 года.

За эти годы сделано немало для развития системы образования и поддержки социального статуса педагогических работников.

Были выделены средства в размере 10% планового фонда зарплаты на установление стимулирующих надбавок; вдвое увеличены средства на премирование; возросли с 20 до 30% надбавки за стаж работы; введены доплаты за квалификационные категории, повышены оклады за инновационную деятельность.

Но, наверное, каждый из делегатов нынешнего съезда согласится и с тем, что сделанное отнюдь не привело к существенному улучшению материального достатка людей, делающих свое дело не на уровне службы, а на уровне служения Отечеству, ее будущему.

Причина, на наш взгляд, кроется в том, что решение главного социального вопроса – достойного уровня оплаты педагогического труда – часто идет по непродуктивной формуле: "шаг вперед – два шага назад". Как следствие – средняя зарплата педагогов не только не достигла уровня в промышленности, но даже снизилась по сравнению с 1996 и 1997 – годом первого съезда. С 1-го июля 2001 года средняя ставка учителя составила 51 тысячу рублей, а труд молодого специалиста на ставку оценен в 41180 рублей.

А мы все бьемся над вопросом: почему работа в школе ну никак не привлекает выпускников педвузов? Потому что они давно уже поняли, что учитель – это человек с умной головой, но, увы, с пустыми карманами.

Нас, кстати, иногда упрекают в излишне прямолинейных расчетах: мол, учитель никогда не работает на одну ставку. Плюс факультативы, кружки, классное руководство и прочее – "на круг", как говорится, выходит вроде бы не так уж мало. Но что за этим скрывается? Не так давно в одной из минских школ меня познакомили с учителем истории. Дабы содержать семью и чувствовать себя ее кормильцем, он ведет 45 часов в неделю и два классных руководства. Пример далеко не единичный.

Думаю, нетрудно догадаться, что этот изнурительный марафон наносит серьезный урон не только здоровью учителя, но и делу обучения и воспитания в целом. Но даже в условиях повсеместной работы с перегрузкой средняя выплаченная зарплата педработникам по итогам 9-ти месяцев этого года составила только 75% от среднего уровня в промышленности.

С заработной платой тружеников системы образования мы как бы попали в замкнутый круг, из которого никак не можем вырваться. И на предыдущем учительском съезде, как и на всех форумах с участием педагогической общественности, неизменно с болью душевной говорилось и о крайне низких ставках многих работников, и о перманентно возникающей (часто – миллиардной!) задолженности по заработной плате, и об отпусках учителей без своевременной выплаты отпускных, как это проявилось и нынешним летом. Да и о других хронических бедах образования, которые давно стали, что называется, "притчей во взыцех".

В контексте сказанного обнадеживает первое интервью нашего нового Министра образования П.И.Бригадина, подчеркнувшего необходимость сделать решительный шаг в повышении уровня оплаты труда педагогических работников.

ЦК профсоюза надеется, что традиции взаимодействия и сотрудничества министерства и отраслевого профсоюза получат дальнейшее развитие и что мы найдем понимание и поддержку наших предложений, внесенных на рассмотрение II съезда учителей. Они аккумулируют результаты встреч и социологических опросов, обращений в ЦК отраслевого профсоюза.

Во-первых, это сохранение в обновляемой редакции Закона об образовании гарантированного уровня финансирования отрасли и заработной платы педагогических работников. Этому могло бы способствовать поэтапное принятие комплекса мер: повышение ставок и должностных окладов за стаж работы с 30 до 40% (как у госслужащих), увеличение доплат за дополнительные виды педагогического труда, повышение тарификации руководителей учреждений образования и ряд других.

Второй блок предложений нацелен на сохранение рабочих мест. Общеизвестно, что складывающаяся демографическая ситуация чревата сокращением классов-комплектов и даже закрытием дошкольных учреждений и школ, а в конечном счете – грозит учительской безработицей. Чтобы смягчить последствия, мы предлагаем снизить норму рабочего времени воспитателя детских дошкольных учреждений с 36 до 30 часов в неделю, учебную нагрузку учителя – до 16–14 часов, уменьшить наполняемость классов и групп, ввести институт освобожденных классных руководителей – эти меры позволят не только трудоустроить высвобождающиеся кадры, но и повысить качество обучения и эффективность воспитательной работы.

Третья позиция, фактически – это требование выполнения решения I съезда, программы "Учитель" по открытию при каждом областном институте повышения квалификации санаториев-профилакториев.

При все возрастающих психофизических нагрузках на учителя, воспитателя заботиться об укреплении его здоровья не только нравственно, но и экономически выгоднее государству и обществу.

По нашему убеждению, на законодательном уровне следует закрепить решение жилищных проблем учительства.

Для человека педагогической профессии нормальные жилищные условия – это не просто показатель достойного уровня жизни, но, если хотите, неотъемлемая составляющая качественного труда. Нет нужды убеждать, что сложнейшая работа по подготовке к уроку, разработки планов, конспектов, требующ уединения, раздумий, нормальной домашней обстановки. Но для более чем 13 тысяч учителей республики дом – это всего лишь угол в арендованном помещении или общежитии. За последние 4 года очередь среди педагогов выросла и составляет около 23 тысяч.

И до тех пор, пока учитель на свою годовую зарплату сможет условно построить не более 3м² жилья, ему просто жизненно необходима поддержка государства, а это – льготные кредиты, право первоочередного их получения. Равно как и возврат сельским учителям льготы на коммунальные услуги.

У профсоюзов сегодня непростые отношения с властью. Нас не слишком жалуют, как гонцов, нередко приносящих плохие вести. Но если бы этих вестей, то есть фактов, не существовало на самом деле – разве смогли бы мы осенью 2000 года собрать в считанные дни 180 тысяч подписей под заявлением "За достойный уровень оплаты труда в отрасли"?

В нашей жизни порой нелегко найти ответственных за неисполнение законов и государственных программ. А коллективные действия в защиту законных интересов выведены фактически за рамки правового поля. К примеру, в той же Франции профессор Сорбонны спокойно оставляет свою кафедру и идет в профсоюзном марше протеста отстаивать права...

И какие бы сегодня споры ни велись вокруг профессиональных союзов, факт остается фактом: к нам обращаются за помощью и защитой, нам доверяют. Сидящие в зале не дадут слукавить: когда весной и летом этого года в республике сложилась поистине кризисная ситуация с выплатами зарплаты и отпускных, то в первую очередь педагогические коллективы и многие учителя обращались в профсоюзные органы и средства массовой информации. Потому что на местах старались, как говорится, сор из избы не выносить...

Мы, разумеется, отдаем себе отчет, что есть пределы возможного и этапы реализации желаемого. И наш профсоюз, как добросовестный учитель, будет продолжать разъяснять, убеждать и доказывать новой власти, что образованию необходимы, как воздух, дополнительные инвестиции, что невозможно построить школу XXI века на одном энтузиазме педагогических кадров.

Спасибо за внимание.

Рэфармаванне патрабуе кваліфікаваных кадраў

Алег ТАЎГЕНЬ, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі:

— Рэфармаванне школы перш за ўсё патрабуе рэфармавання настаўніка. У сучасных сацыякультурных умовах Беларусі гэта азначае, што развіццё агульнай сярэдняй адукацыі ў значнай ступені вызначаецца тым, наколькі эфектыўна ажыццяўляецца падрыхтоўка ў ВНУ, бесперапыннае павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка педагогаў.

У нас ёсць разгалінаваная сетка ВНУ, якія рыхтуюць педагагічныя кадры. Завяршылася станаўленне Акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Усё гэта дало магчымасць Акадэміі паслядыпломнай адукацыі стаць галаўным навукова-метадычным і адукацыйным цэнтрам, які забяспечвае развіццё метадычнай службы рэспублікі і сістэмы паслядыпломнай педагагічнай адукацыі.

Завяршаецца пераўтварэнне інстытутаў удасканалення настаўнікаў у інстытуты павышэння кваліфікацыі кадраў адукацыі. Патрэбна адзначыць, што ўсе абласныя інстытуты маюць пэўны патэнцыял для паляпшэння якаснага складу выкладчыкаў кафедр. У прыватнасці, толькі ў аспірантуры Акадэміі паслядыпломнай адукацыі па накіраваннях абласных інстытутаў займаецца на дзённай форме 25 чалавек, завочна – 60, 49 чалавек з'яўляюцца саіскальнікамі. У названую колькасць уваходзяць і 30 супрацоўнікаў абласных ІПК. Гэтыя пераўтварэнні ствараюць аснову для пераводу абласных інстытутаў у рэгіянальныя цэнтры развіцця адукацыі з магутным кадравым і навуковым патэнцыялам, здольныя аказваць уздзеянне на сістэму адукацыі ва ўмовах рэформы.

Паўсюдна аднаўляюцца раённыя і гарадскія метадычныя кабінеты. Сёння яны функцыянуюць у 125 гарадах і раённых цэнтрах. Усе метадычныя цэнтры аказваюць адукацыйным установам дзейсную педагагічную падтрымку ў працэсах рэфармавання адукацыі. Дзейнасць метадычных кабінетаў накіравана на перавод школы ў новы якасны стан, арыентаваны на каштоўнасці новай адукацыйнай палітыкі, які адпавядае інтарэсам вучняў, педагогаў, дзяржавы і грамадства.

На прынцыпова новай аснове будуюць сваю работу школьныя метадычныя аб'яднанні. У адных школах, асабліва новага тыпу, уведзена пасада намесніка дырэктара па навукова-метадычнай рабоце, у другіх, якія супрацоўнічаюць з вышэйшымі педагагічнымі ўстановамі, створаны адпаведныя кафедры, функцыянуюць школьныя псіхалагічныя службы.

Асноўную ўвагу школьныя метадычныя аб'яднанні звяртаюць на асваенне настаўнікамі і ўкараненне ў практыку новых адукацыйных тэхналогій. У школы прыходзяць вучоныя, метадысты раёна, вобласці, рэспублікі, выкладчыкі ВНУ, аспіранты для правядзення даследаванняў, для арганізацыі семінараў-практыкумаў, семінараў-трэнінгаў, для правядзення навукова-практычных канферэнцый, нарад і кансультацый.

У некаторых школах традыцыйныя метадычныя аб'яднанні, як ужо гаварылася, перайменавалі ў кафедры. І там, дзе на кафедры працуюць вучоныя, дзе праводзяцца адпаведныя даследаванні, гэта мэтазгодна і абгрунтавана. Аднак многія нядаўна створаныя школьныя кафедры аб'ядноўваюць толькі школьных настаўнікаў розных прадметаў і вядуць традыцыйную работу па формах і па змесце. Больш аслабленай аказваецца метадычная работа па прадмеце і не становіцца больш эфектыўнай работа па ўзмацненні агульнадыдактычнай падрыхтоўкі настаўнікаў. Такім чынам, простая замена назвы на больш модную і навуковую не заўсёды прыводзіць да больш высокага ўзроўню і вынікаў работы.

Адзін з напрамкаў дзейнасці навучальных устаноў паслядыпломнай адукацыі – перападрыхтоўка кадраў з улікам рэформы школы і спецыфікі развіцця агульнаадукацыйнай сістэмы ў рэгіёнах рэспублікі. Вызначыўся шэраг найбольш запатрабаваных спецыяльнасцей перападрыхтоўкі: інфарматыка, практычная псіхалогія, сацыяльная педагогіка, дэфекталогія, замежныя мовы. За 1998–2000 гады атрымалі новую кваліфікацыю больш як дзве тысячы педагагічных работнікаў. Работа навучальных устаноў паслядыпломнай адукацыі ў галіне перападрыхтоўкі педагагічных кадраў характарызуецца навукова абгрунтаваным фарміраваннем зместу, форм і метадаў навучання, высокім узроўнем кваліфікацыі выпускнікоў.

Аднак сёння настолькі імклівыя перамены ў свеце і ў нашай краіне, што неабходна пастаянная перакваліфікацыя і перападрыхтоўка кадраў. Надышоў час рэальнага ажыццяўлення формулы "Адукацыя праз усё жыццё". У сувязі з гэтым інстытутам сістэмы павышэння кваліфікацыі работнікаў адукацыі трэба вырашыць шэраг праблем.

Першая. Забеспячэнне кафедр інстытутаў павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічнымі кадрамі. Гэта недапушчальна, што сёння большасць навуковых супрацоўнікаў кафедр не маюць навуковых ступеняў і званняў. Больш за тое, значную колькасць работнікаў кафедр складаюць людзі пенсійнага або перадпенсійнага ўзросту. Гэта выклікана ў першую чаргу тым, што адсутнічае паўнацэннае матэрыяльнае стымуляванне высокакваліфікаваных педагагічных кадраў. Наспела неабходнасць стварэння нарматыўна-прававых актаў аб паслядыпломнай педагагічнай адукацыі.

Другая. Максімальна наблізіць змест заняткаў да патрэбнасцей і запытаў рэфармуемай школы. Чаго грахі ўтойваць, часта інфармацыя, якую педагогі атрымліваюць у інстытутах павышэння кваліфікацыі, не носіць апераджальнага характару, што не садзейнічае павышэнню іх прафесійнага ўзроўню.

Трэцяя. У існуючай сацыяльна-культурнай сітуацыі неабходна ўзмацніць філасофска-метадалагічны кампанент у сістэме паслядыпломнай адукацыі. Ён садзейнічае развіццю ў педагогаў культуры мыслення, здольнасці аналізаваць дынамічныя адукацыйныя працэсы.

Чацвёртая. У змесце павышэння кваліфікацыі педагагічных кадраў першаступенную ўвагу трэба надаць навучанню актыўнаму, самастойнаму пошуку інфармацыйных тэхналогій. Менавіта на вопыце актыўнага пошуку інфармацыйных тэхналогій забяспечваецца станаўленне і развіццё прафесіяналізму педагогаў, развіццё іх як даследчыкаў, здольных практычна інтэрпрэтаваць сучасныя навуковыя дасягненні, ажыццяўляць аналітычную і тэхналагічную дзейнасць.

Пятая. У сістэме перападрыхтоўкі педагагічных кадраў трэба пераходзіць ад монаадукацыі да поліадукацыі. Вузкая спецыялізацыя, напэўна, магчыма на першай ступені атрымання спецыяльнасці, але мала карысная на больш позніх этапах навучання. Змяненне кан'юнктура рынку, змяненне жыццёвых прыярытэтаў, звязанае, у тым ліку, і з набыццём вопыту рэальнай прафесійнай дзейнасці, будзе перажыта значна больш лёгка ў выпадку поліадукацыі.

Шостая. Асаблівую ўвагу ў сістэме павышэння кваліфікацыі педагогаў трэба ўдзяліць праблемам выхавання. Выхаванне – гэта не асобны від дзейнасці, а функцыя любой педагагічнай дзейнасці. З гэтай мэтай неабходна кожнага педагагічнага работніка знаёміць з асаблівасцямі і праблемамі выхавання сучасных дзяцей. Сёння правядзенне выхаваўчай работы неабходна не толькі ў школе, але і ў соцыуме, дзе больш за ўсё знаходзіцца дзіця. Максімальнае ўключэнне ўсёй адукацыйна-выхаваўчай прасторы ў працэс выхавання школьнікаў дазволіць не толькі палепшыць функцыянаванне школы як адкрытай сацыяльна-педагагічнай сістэмы, але і актыўна ўплываць на сацыяльнае асяроддзе, змяняючы яго з пазіцый адукацыі. Гэта дапаможа хутчэй і эфектыўней вырашаць складаныя сацыяльна-эканамічныя задачы грамадства і дзяржавы.

Сёмая. Адукацыйным установам сістэмы павышэння кваліфікацыі трэба лічыць прыярытэтнай задачай развіццё Internet, укараненне камп'ютэрных тэхналогій у працэс навучання; павышэнне кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі ў галіне сучасных камп'ютэрных тэхналогій.

Сёння ўсё больш актуалізуецца праблема станаўлення і развіцця прафесіяналізму настаўнікаў, што звязана са зменлівым характарам сацыяльнага заказу школе і з неабходнасцю вырашэння школай новых адукацыйных задач. Па аб'ектыўных прычынах педагагічныя ВНУ не могуць у дастатковай ступені забяспечыць будучым спецыялістам эфектыўнае авалоданне новым зместам і спосабамі дзейнасці ў рэфармуемай школе. Гэта абумоўлена тым, што неабходнай умовай прафесійнага росту педагога з'яўляецца асэнсаванне і развіццё ім уласнага вопыту педагагічнай дзейнасці. Аднак, акрамя таго, ёсць і шэраг суб'ектыўных прычын, якія абумоўліваюць невысокі ўзровень кваліфікацыі выпускнікоў. Па-першае, абнаўленне вучэбных праграм у ВНУ адбываецца надзвычай марудна, таму яны не аператыўна рэагуюць на праблемы, змены і прагрэс у соцыуме, у навуцы і педагагічнай практыцы. Выпускнікі педагагічных ВНУ валодаюць павярхоўнай падрыхтоўкай у галіне сучасных інфармацыйных тэхналогій і не маюць вопыту работы ў галіне практычнага і метадычнага выкарыстання камп'ютэрных праграмна-метадычных комплексаў па навучанні асобным прадметам.

Не забудзем, што на двары XXI стагоддзе! Да гэтага часу не вырашана праблема падрыхтоўкі настаўніка як дырэктара школы. У нас увогуле адсутнічае падрыхтоўка кіраўнікоў адукацыйных устаноў.

Наступная праблема заключаецца ў тым, што сучасны спецыяліст нярэдка паранейшаму зарыентаваны толькі на прыярытэт ведаў і не заўсёды можа аказаць дапамогу дзецям і бацькам у сацыялізацыі вучняў, выхаванні ў іх неабходных для сучаснага жыцця асобасных якасцей і адпаведных жыццёвых навыкаў. Ідэалагічная ж разгубленасць дарослых, невалоданне імі метадамі і тэхналогіямі фарміравання сацыяльных навыкаў правакуе моладзь на самастойныя пошукі дасягнення сваіх мэт, не заўсёды адэкватных і бяспечных.

Усё гэта абумоўлівае павелічэнне ролі сістэмы павышэння кваліфікацыі ў рэалізацыі рэформы агульнаадукацыйнай школы.

Наогул, адной з галоўных тэарэтычных і практычных праблем бесперапыннай адукацыі на сучасным этапе з'яўляецца забеспячэнне пераемнасці паміж сістэмамі агульнай сярэдняй, вышэйшай педагагічнай адукацыі і павышэння кваліфікацыі работнікаў адукацыі.

Адным са шляхоў вырашэння гэтай праблемы з'яўляецца той, пры якім функцыі павышэння кваліфікацыі педагогаў перадаюцца педагагічным ВНУ. Аднак ёсць, на нашу думку, сур'ёзныя аргументы супраць такога шляху вырашэння гэтых праблем. Па-першае, аб'ектыўны аналіз вопыту 70–80 гадоў (наяўнасць факультэта павышэння кваліфікацыі дырэктараў сярэдніх школ у Мінскім педінстытуце, які не змог вырашыць праблему падрыхтоўкі настаўніка як дырэктара школы, а таксама спроба аб'яднання Віцебскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў з Віцебскім педінстытутам і г.д.) паказвае, што ў ВНУ няма вопыту павышэння кваліфікацыі, няма адпаведных педагагічных кадраў і традыцый для арганізацыі павышэння кваліфікацыі педагогаў. Па-другое, адукацыйныя праграмы ў сістэме павышэння кваліфікацыі хоць і уніфікуюцца на аснове дзяржаўных стандартаў, але ў той жа час прапануюць педагогам і кіраўнікам адукацыйных паслуг і адпаведнасці з іх патрэбнасцямі і запытамі, з правам выбару.

Усё гэта вызначае прыярытэтнасць галоўных сацыяльна-педагагічных задач, якія павінны вырашацца менавіта ў Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і абласных інстытутах. Гэта:

– падрыхтоўка кіраўнікоў (менеджэраў) адукацыі, якія ўваходзяць у рэзерв кіруючых кадраў, які пастаянна абнаўляецца;

– стварэнне арганізацыйна-педагагічных умоў для прафесійнай адаптацыі маладых спецыялістаў, станаўлення і развіцця прафесіяналізму педагогаў;

– псіхолага-педагагічная падтрымка інавацый, настаўнікаў-эксперыментатараў;

– асваенне педагогамі і кіраўнікамі новых педагагічных, інфармацыйных і выхаваўчых тэхналогій;

– перападрыхтоўка педагогаў па дэфіцытных спецыяльнасцях;

– падрыхтоўка спецыялістаў на базе сярэдняй спецыяльнай педагагічнай адукацыі.

У сувязі з апошнім уяўляецца цікавым разгледзець пытанне аб увядзенні ў структуру Акадэміі паслядыпломнай адукацыі педвучылішча або педкаледжа.

Зроблена вялікая работа па абнаўленні зместу адукацыі ў агульнаадукацыйных школах, звязаная з пераходам на 12-гадовы тэрмін навучання. Распрацаваны новы вучэбны план, пра

З выступленняў дэлегатаў II з'езда настаўнікаў

Міхаіл СЕЛЬКІН, рэктар Гомельскага дзяржаўнага універсітэта:

— Сучаснае жыццё прад'яўляе новыя, больш высокія патрабаванні да адукацыйнай сістэмы. Гэтым і абумоўлена правядзенне рэформы ў адукацыйнай сферы. Што ж трэба зрабіць на цяперашнім этапе ажыццяўлення рэформы, каб не страціць лепшае з дасягнутага нашай адукацыяй раней, адначасова дынамічна развіваючы яе, зыходзячы з патрэб беларускага грамадства ўжо XXI стагоддзя. Рэформа ў адукацыі накіравана перш за ўсё на дасягненне гэтых мэт. І сёння яна ўжо паказала, што наспела неабходнасць у вырашэнні новых задач.

Перш за ўсё як у сярэдняй, так і ў вышэйшай школе трэба звярнуць сур'ёзную ўвагу на фундаментальную адукацыю, на вывучэнне дысцыплін прыродазнаўчанавуковага цыкла. Бо наша адукацыя заўсёды цанілася за трывалась ведаў выпускнікоў па такіх дысцыплінах, якія маюць выразную прыкладную арыентацыю. А ў нас узнікла проста парадаксальная сітуацыя: пры відавочным якасным скачку навукова-тэхнічнага прагрэсу ў свеце мы добравхотна адмаўляемся ад сур'ёзнага выкладання матэматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі ў школе, страчваючы пры гэтым значна больш, чым набываем. Я не супраць гуманітарызацыі адукацыі, але яна павінна ажыццяўляцца ў разумных межах.

Неабходна сказаць і пра тое, што сёння школьныя і інстытуцкія вучэбныя планы імкнуцца ахапіць неахопнае. І, як вынік, большасць вучняў і студэнтаў мае адхіленні ў здароўі, моладзі не хапае часу для самастойнай падрыхтоўкі, паўнацэннага адпачынку. Таму ў школах і ВНУ павінен быць перагледжаны і дакладна вызначаны змест базавай адукацыі ў рамках дзяржаўнага фінансавання.

Дадатковае навучанне (профільнае, паглыбленае і г.д.) павінна ажыццяўляцца са згоды бацькоў у парадку аказання платных паслуг. Надзвычай важна ў сацыяльным кантэксце, каб усе сярэднія навучальныя ўстановы знаходзіліся ў роўных умовах. Гэта, вядома, не датычыць сістэмы падтрымкі адоранай моладзі, якая склалася і паспяхова рэалізуецца ў краіне. Такія мерапрыемствы дазволяць не толькі павысіць узровень адукацыі ў цэлым, але і значна палепшыць матэрыяльнае становішча педагогаў, таму што колькасць гадзін, якія фінансуюцца з бюджэту, зменшыцца, а значыць павялічыцца кошт адной гадзіны (плюс платныя паслугі).

Вопыт першых этапаў рэформы ў адукацыі паказаў, што паспяховасць яе шмат у чым залежыць ад наяўнасці добрых, грунтоўных, глыбока прадуманых падручнікаў.

Менавіта недастатковай якасцю падручнікаў, як і зніжэннем узроўню выкладання прыродазнаўчых і дакладных дысцыплін, можна патлумачыць тое, што па-ранейшаму вострай застаецца праблема атэстацыі выпускнікоў сярэдніх школ, якія прэтэндуюць на залаты або сярэбраны медаль. Статыстычныя даныя апошніх гадоў сведчаць, што толькі 40–50 працэнтаў медалістаў сёння паступаюць у ВНУ рэспублікі, а каля 25–30 працэнтаў залічаных медалістаў здаюць першыя сесіі ў ВНУ з адзнакамі "2" і "3". Пытанні ўдасканалення сістэмы атэстацыі медалістаў неаднаразова абмяркоўваліся на многіх узроўнях, аднак з году ў год становішча не мяняецца.

Мы прапануем схему атэстацыі медалістаў, якая прадугледжвае выкарыстанне сістэмы цэнтралізаванага дзяржаўнага тэсціравання, што развіваецца ў нашай рэспубліцы. Сутнасць гэтай схемы заключаецца ў тым, каб абавязаць усіх кандыдатаў на медалі прайсці ў красавіку цэнтралізаванае тэсціраванне па некаторых прадметах, і толькі пры ўмове здачы гэтых іспытаў на адзнакі "4", "4,5" або "5" дапускаць іх да існуючай сістэмы атэстацыі на залаты або сярэбраны медаль. Зазначым, што сістэма цэнтралізаванага тэсціравання прад'яўляе дастатковая жорсткія патрабаванні да ведаў. Як паказвае практыка, толькі добра падрыхтаваныя вучні паспяхова спраўляюцца з заданнямі тэстаў.

Дзяржаўны маштаб рэформы ў адукацыі зусім не выключае, а наадварот, узмацняе ролю рэгіянальнага фактара. Таму Міністэрству адукацыі трэба распрацаваць паслядоўную канцэпцыю, у прыватнасці ў дачыненні да рэгіянальных класічных універсітэтаў. Для каардынацыі дзейнасці ў рэгіянальнай адукацыйнай палітыцы рэгіянальных класічных універсітэтаў неабходна надаць ім асаблівую ролю. З гэтай мэтай Міністэрства адукацыі павінна прыняць нарматыўны акт, у якім дакладна вызначыць правы і абавязкі такіх універсітэтаў сумесна з Саветам рэктараў і аблвыканкамамі, павялічыўшы пры гэтым правы ВНУ і ўпраўленняў адукацыі аблвыканкамаў. Фактычна гэта павінны быць філіялы Міністэрства адукацыі ў рэгіёнах.

У 90-я гады ў краіне з'явіліся і прыватныя вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе, як вядома, попыт выклікае прапанову. У выніку ВНУ часта арыентаваны толькі на колькасную падрыхтоўку эканамістаў, юрыстаў і спецыялістаў замежных моў. На нашу думку, Міністэрству адукацыі трэба звярнуць асаблівую ўвагу на якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у прыватных вышэйшых навучальных установах. На жаль, існуючая сістэма акрэдытацыі і атэстацыі, работа шматлікіх камісій па праверцы такіх ВНУ малаэфектыўная і патрабуе значных фінансавых сродкаў. Нам здаецца, што і ў гэтай справе трэба вярнуцца да добра праверaных сродкаў. Яшчэ ў царскай Расіі ўсе выпускнікі прыватных навучальных устаноў былі абавязаны здаваць дзяржаўныя экзамены дзяржаўным камісіям дзяржаўных ВНУ. Такая практыка дазволіць незалежна і аб'ектыўна ацаніць якасць падрыхтоўкі выпускнікоў у прыватных ВНУ і ў выпадку пацвярджэння высокай якасці з поўным правам выдаваць выпускнікам дыпломы дзяржаўнага ўзору.

Генадзь СЕХ, майстар вытворчага навучання Брэсцкага ПТВ № 65 будаўнікоў:

— Якасць падрыхтоўкі маладых рабочых у нашых навучальных установах залежыць ад многіх фактараў, але галоўная роля адведзена майстру вытворчага навучання. Асаблівасць прафесійна-тэхнічнай адукацыі заключаецца ў тым, што навучанне і выхаванне ў значнай меры ажыццяўляюцца ў працэсе вытворчага навучання, у тым ліку ва ўмовах вытворчасці. І поспех гэтай справы знаходзіцца перш за ўсё ў руках майстра-настаўніка. Вельмі важна, каб і арганізацыі, і прадпрыемствы больш увагі надавалі прафарыентацыі моладзі і кадравай палітыцы ўвогуле.

Хачу сказаць, што ў навучальных установах прафтэхадукацыі – толькі 5 працэнтаў абсталявання з тэрмінам эксплуатацыі менш як 5 гадоў. Астатняе абсталяванне ў значнай меры састарэла. У будаўнічай галіне сёння выкарыстоўваюцца новыя прагрэсіўныя тэхналогіі і матэрыялы. А вучылішча не мае фінансавых магчымасцей для набыцця новага абсталявання і сучасных сродкаў навучання. Таму навучэнцы не заўсёды належным чынам падрыхтаваны да выканання пэўных відаў работ к часу праходжання вытворчай практыкі на прадпрыемствах. Гаварыць пра высокую якасць падрыхтоўкі рабочых кадраў у такіх выпадках не даводзіцца. Такая сітуацыя ўсё часцей узнікае і ў вучылішчах іншага профілю.

Сёння эканамічны стан галіны не заўсёды складваецца такім чынам, каб яна мела магчымасць дапамагчы ў падрыхтоўцы кваліфікаваных канкурэнтаздольных рабочых.

У гэтых складаных умовах трэба паляпшаць сувязі з вытворчасцю. Гэтаму садзейнічала б пашырэнне практыкі заключэння дагавораў на падрыхтоўку спецыялістаў. Гэтыя дагаворы давалі б магчымасць навучэнцам асвойваць прафесію на сучасным узроўні, а прадпрыемства атрымала б патрэбнага спецыяліста.

Я ўпэўнены, што меры па падтрымканні і развіцці вучэбна-матэрыяльнай базы прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў павінны прымацца на дзяржаўным узроўні. Неабходна ў бюджэце прадугледзець асобны артыкул для выдзялення сродкаў на прафтэхадукацыю.

Навучанне і выхаванне будучага рабочага адбываюцца больш за ўсё на ўроку вытворчага навучання: у вучэбных майстэрнях, за станком, на будаўнічай пляцоўцы, у полі, на ферме. Майстар павінен не толькі даваць навучэнцам веды па спецыяльнасці. Ён павінен умець праектаваць развіццё інтэлекту выхаванца, яго маральную, прафесійную і эстэтычную культуру.

У апошнія гады абвастрылася праблема забеспячэння педагагічнымі кадрамі прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў. Пераважна з-за нізкай аплаты працы вучылішча пакідаюць найбольш кваліфікаваныя работнікі – і перш за ўсё майстры вытворчага навучання. Быць майстрам вытворчага навучання сёння ўсё больш складана, асабліва на прадпрыемствах, у арганізацыях галін эканомікі. Аналагічныя катэгорыі работнікаў атрымліваюць значна большую заработную плату. І калі не рабіць захады па павелічэнні заработнай платы спецыялістам-практыкам і маладым спецыялістам, дык у бліжэйшыя пяць гадоў не стане майстроў, якія змогуць забяспечыць выпускніку высокі ўзровень кваліфікацыі.

І ўсё-такі, нягледзячы на існуючыя праблемы, сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі паспяхова выконвае задачы падрыхтоўкі кваліфікаваных рабочых.

Таццяна МАКРЫЦКАЯ, настаўніца Хацюхоўскай сярэдняй школы Крупскага раёна:

— Паколькі я працую ў сельскай школе, то ў сваім выступленні хачу спыніцца на дасягненнях апошніх гадоў і праблемах, якія стаяць перад вясковымі настаўнікамі.

У рэзалюцыі І з'езда настаўнікаў было сказана аб распрацоўцы, фінансаванні і рэалізацыі асобных рэспубліканскіх праграм. Адной з іх і з'яўлялася праграма "Сельская школа". Праграма была распрацавана. Таму хочацца задаць пытанні: што зроблена? Якія змены адбыліся ў вясковай школе? І ці адбыліся наогул? А змены ёсць. І яны відавочныя.

Сёння перад сельскімі школамі стаяць тыя ж вучэбна-выхаваўчыя задачы, што і перад гарадскімі. Ва ўмовах рэфармавання вучэбна-выхаваўчага працэсу адной з такіх задач з'яўляецца выяўленне і развіццё прыродных задаткаў і творчага патэнцыялу кожнага вучня. У сувязі з гэтым сённяшняя сельская школа бярэ курс на дыферэнцыраванае навучанне, якое накіравана на развіццё асобы школьніка, яго схільнасцей і здольнасцей. Гэта асабліва важна таму, што сельскія вучні не маюць магчымасці займацца ў гімназіях, ліцэях і іншых навучальных установах, якія мэтанакіравана вядуць моладзь да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. Унутраная дыферэнцыяцыя не дазваляе ў поўнай меры развіваць здольнасці кожнага вучня, таму асабліва ўвага ўдзяляецца знешняй дыферэнцыяцыі.

Колькасць жадаючых атрымаць фундаментальныя веды па асобных прадметах сярод вясковых вучняў з кожным годам павялічваецца. І таму, нягледзячы на малакамплектнасць, у многіх сельскіх школах Крупскага раёна, які я прадстаўляю, адкрыты профільныя групы. Прывяду прыклад: у нашай Хацюхоўскай сярэдняй школе ў 1997 годзе толькі 25% старшакласнікаў вывучалі асобныя прадметы на павышаным узроўні, а ў 2001 годзе – ужо 50% вучняў 8–11 класаў займаюцца ў профільных групах. У выніку заняткаў у такіх групах вучні больш свядома падыходзяць да выбару прафесіі, павышаецца ўзровень іх ведаў, што дае магчымасць паказваць высокія вынікі на раённых, абласных і нават на рэспубліканскіх прадметных алімпіядах, добра здаваць уступныя экзамены ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Настаўнікамі сельскай школы паспяхова асвойваюцца новыя педагагічныя тэхналогіі, бо ўсе яны, педагогі, разумеюць неабходнасць пераносу акцэнтаў на асобу вучня ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Аднак і тут ёсць свае цяжкасці. Калі гарадскі настаўнік мае магчымасць пры патрэбе наведваць бібліятэкі з багатым фондам метадычнай літаратуры, дык у распараджэнні сельскага настаўніка – толькі невялікі фонд школьнай бібліятэкі і метадычная літаратура, якую ён набывае за ўласныя грошы. Але ці многа яе можна набыць, калі яна каштуе дорага? Я мяркую, што трэба ўдзяляць больш увагі забеспячэнню метадычнай літаратурай менавіта сельскіх школьных бібліятэк.

На шляху рэалізацыі рэформы ў сельскай школе ёсць свае праблемы. Адна з іх – гэта матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне. Мы не маем магчымасці пры патрэбе карыстацца тэхнічнымі сродкамі навучання, бо іх не хапае ці зусім няма. Як можна вывучаць інфарматыку на маральна застарэлых камп'ютэрах? Але настаўнікі сумленна і адказна ставяцца да сваёй працы, робячы ўсё, што ад іх залежыць.

Другая наша праблема – кадравая. Сёння ў вясковай школе вялікая колькасць настаўнікаў перадпенсійнага ўзросту. Маладыя настаўнікі не затрымліваюцца доўга на вёсцы, бо існуе праблема, звязаная з жыллём. Цяжка настаўніку пабудаваць на сваю зарплату жыллё, забяспечыць сябе палівам. І безумоўна, лад жыцця сельскага настаўніка палохае моладзь. Таму, я лічу, неабходна на дзяржаўнай аснове выдзяляць ільготныя крэдыты пад малы працэнт і на вялікі тэрмін маладым сельскім настаўнікам для будаўніцтва жылля, а таксама ўзнавіць ільготы, якія раней дзейнічалі для педагогаў сельскай мясцовасці.

Наступная праблема – гэта вучэбная нагрузка настаўніка. У сельскага настаўніка няма паралельных класаў, а ў маленькіх школах настаўнік выкладае некалькі прадметаў, і якасна падрыхтавацца да ўрокаў вельмі складана. Таму ў вясковага настаўніка мала вольнага часу. Акрамя школьных спраў, яму трэба памятаць і пра сваю гаспадарку, бо ён не можа набыць у краме малако ці смятану. Мне здаецца, трэба перагледзець вучэбную нагрузку настаўніка ў бок яе памяншэння. Гэтая ж праблема стаіць перад выхавальнікамі груп прадоўжанага дня і дзіцячых садоў.

Я закранула толькі самыя балючыя праблемы вясковай школы. Але жыццё працягваецца. Мы павінны памятаць, што мы – настаўнікі. І як бы нам цяжка ні было, галоўная наша задача – выхоўваць сапраўдных грамадзян сваёй краіны. У нашых руках – наша будучыня, лёс нашай краіны, бо настаўнік працуе над самай адказнай задачай – ён фарміруе чалавека.

Уладзімір ГАЛАЎЧЭНКА, урач-псіханеўролаг цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Маскоўскага раёна Брэста:

– Як урач-неўролаг, я хацеў бы звярнуць увагу педагагічнай грамадскасці вось на якія цяжкасці. Я ўважліва слухаў дэфектолага з Магілёва і хачу сказаць, што псіхафізічныя асаблівасці зараз могуць узнікаць у школе ў цалкам здаровага чалавека, і зводзяцца яны ў асноўным да неўратызацыі асобы. Паводле апошніх нашых даных, на неўрозы пакутуе ад 30 да 50 працэнтаў вучняў. Мы спрабавалі знайсці прычыны. Іх атрымалася тры. Галоўная – праграмы. Можа, нам трэба ўвесці такое паняцце як педагагічная экалогія? Неабходна праводзіць псіхалагічную экспертызу праграм, падручнікаў. Бо фізічна дзеці не спраўляюцца з большасцю сучасных праграм і ў выніку – упадаюць у неўратызацыю, а яна вядзе да псіхапатызацыі. Пасля чаго замест нармальнага дзіцяці мы бачым чалавека са зрухамі ў свядомасці.

Яшчэ б я хацеў звярнуць увагу на пытанне па стварэнні інтэграваных класаў у школе. Ідэя – дасканалая. Дзеці могуць знаходзіцца сярод сваіх аднагодкаў (здаровых дзяцей). Але тут патрабуецца свая дыферэнцыяцыя, бо асаблівасці таксама бываюць розныя. Калі гэта дзеці з парушэннямі слыху, зроку, апорна-рухальнага апарата – тады інтэграваны клас дарэчы. Гэта і гуманна, і правільна, і карысна. Як для хворых дзяцей, так і для здаровых, бо яны вучацца міласэрнасці. Але калі ў такім класе знаходзяцца дзеці з разумовымі, кагнітыўнымі адхіленнямі, то такое не зусім добра для астатніх вучняў. У маёй практыцы ёсць выпадкі, калі бацькі (здаровых дзяцей) выступалі супраць сумеснага навучання, звярталіся ў суд за дапамогай. Для такіх дзяцей трэба ствараць асобныя класы.

Сёння мы яшчэ вялі размову аб тым, каб зрабіць суботу выхадным днём для нашых вучняў. Але я з упэўненасцю магу сказаць, што дзеці ў гэты дзень не пойдуць у спартыўную залу, а накіруюцца ў камп'ютэрны салон. А з камп'ютэрамі, якімі мы ўсе сёння "захапіліся", – таксама сур'ёзныя праблемы. Ужо адзначаюцца выпадкі камп'ютэрных неўрозаў. Толькі па маім участку (Маскоўскі раён Брэста) я ведаю два такія неўрозы. Дзеці пагружаюцца ў віртуальны свет – і на гэтым іх сацыяльнае развіццё заканчваецца.

Епіскап Полацкі і Глыбоцкі ФЕАДОСІЙ:

– Паважаныя педагогі! Дазвольце павітаць Вас як прадстаўнікоў самай гуманнай, самай высакароднай, самай мужнай прафесіі. Мужнай – таму што Вы ўзялі на сябе мужнасць выхавання і навучання падрастаючага пакалення. Сёння было шмат сказана, што будучыня нашага народа, нашай краіны – у Вашых руках.

Але наша будучыня далёка не бясхмарная. Адзначаецца павелічэнне дзіцячай злачыннасці ў апошні час, а таксама цікавасць школьнікаў да сатанізму – гэтай духоўнай язвы нашага часу. Такія негатыўныя з'явы – характэрныя для ўсіх краін свету. Рост злачыннасці, наркаманія, суіцыд, распад сям'і – гэта ўсё наступствы глыбокай бездухоўнасці. Парадокс. Але XX стагоддзе – стагоддзе навукова-тэхнічнага прагрэсу – выклікала катастрафічныя змены ў чалавечай маралі і духоўных каштоўнасцях. Маштаб гэтых змен такі. Калі на пачатку XX стагоддзя ў кожнай губерні на год адзначаліся 1 – 2 забойствы, менш аднаго разводу, а суіцыд быў справай выключнай, дык у канцы – толькі ў сярэдняй (паводле сваіх памераў) вобласці здараецца ўжо 600 – 700 забойстваў, і палова з іх – асаблівай цяжкасці. Распадаецца кожны другі шлюб. Суіцыд стаў звычайнай з'явай. Дзе вытокі гэтага маральнага бедства? Яны – ўнутры чалавека.

Учора я з цікавасцю прачытаў артыкул у "Советской Белоруссии", які быў прысвечаны другому з'езду. Адзін настаўнік піша, што асоба дзіцяці не развіваецца. У газеце "Воскресение" расказваецца пра вопыт педагогаў, якія летам працавалі ў дзіцячым летніку. Яны занепакоены тым, што дзіцячыя душы аказаліся неўзаранымі. Пустазелля столькі, што не ведаеш, як ад яго ачысціцца. З сэрца і душы чалавека зыходзяць намеры зла, забойства, сваволля. Мендзялееў некалі сказаў, што адукацыя без выхавання – гэта нож у руках вар'ята.

Самым актуальным сёння з'яўляецца пытанне духоўна-маральнага выхавання падрастаючага пакалення. У гэтым плане наша краіна мае вялікую духоўную скарбніцу. Багацце яе вызначаецца колькасцю добрых спраў, якія ўнеслі нашы слаўныя продкі. Святы Кірыл Тураўскі – ягоныя творы стаяць у адным шэрагу з шэдэўрамі паэзіі і прозы старажытнай Грэцыі. Полацкія дойліды ў XIII стагоддзі стварылі такі храм, які ўражвае сваёй прыгажосцю і з'яўляецца ўпрыгожаннем нашай зямлі. Прападобная Ефрасіння Полацкая прынесла ў дар нашаму народу першую айчынную кніжку. Гэтыя асобы безмежна абагацілі скарбніцу нашага народа і самі былі святымі. Кожная асоба – гэта эталон хрысціянскай любові, міру і міласэрнасці. Гэта наш гонар, нашы духоўныя вытокі. І мы павінны дзеля дабрабыту нашых людзей, дзеля будучыні нашай краіны вярнуцца да нашых духоўных і благаславенных вытокаў.

Андрэй ЛУК'ЯНОВІЧ, начальнік упраўлення адукацыі Гомельскага выканаўчага камітэта:

— Азіраючыся на гады, што прайшлі пасля першага з'езда, здзіўляешся, як шмат удалося зрабіць за такі кароткі адрэзак часу. Праецыруючы гэтыя працэсы на нашу галіну, нельга не заўважыць, якія значныя пераўтварэнні адбыліся ў сетцы ўстаноў.

У кожнай другой сельскай школе вобласці за кошт стварэння профільных груп вучням прадастаўляюцца адукацыйныя паслугі на павышаным або паглыбленым узроўнях. Адкрыты 54 тэхналагічныя профілі, 19 агракласаў. Звыш 10 працэнтаў школ з'яўляюцца эксперыментальнымі пляцоўкамі, 44 працэнты школ працуюць у эксперыментальным рэжыме. Рэалізуючы асноўныя палажэнні дзяржаўнай праграмы "Інфарматызацыя сістэмы адукацыі", упраўленнем распрацаваны і ўкараняецца праект стварэння інфармацыйнай прасторы. Ужо створана і пачала дзейнічаць карпаратыўная інфармацыйная сетка.

У Гомельскай вобласці праблемы ў значнай ступені звязаны з наступствамі катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, што патрабуе вялікіх дадатковых намаганняў ад аддзелаў і ўстаноў адукацыі. Так, напрыклад, 78 працэнтаў вучняў ахоплены 2–3-разовым бясплатным харчаваннем, а гэта, зразумела, ускладвае на нас адказнасць за арганізацыю кальцавога завозу прадуктаў, падтрыманне ў рабочым стане тэхналагічнага абсталявання, якое з-за павышанай нагрузкі інтэнсіўна зношваецца. Або другі важны напрамак работы – аздараўленне. Звыш 80 працэнтаў вучняў абавязкова павінны аздараўлівацца, у тым ліку 15 працэнтаў – двойчы ў год. У адпаведнасці з Законам "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС" – гэта абавязковы працэс, і мы ўдзячны разумнай палітыцы дзяржавы за клопат пра здароўе дзяцей. Аднак нас хвалюе сур'ёзная праблема, што ўзнікае пры гэтым. Штогод два месяцы з дзесяці вучэбных дзеці знаходзяцца на аздараўленні. За дзесяць гадоў вучобы набягае два гады. Так, дзяржавай уведзены сур'ёзныя льготы пры паступленні ў ВНУ для дзяцей з гэтых раёнаў. Аднак, бясспрэчна, падмурак ведаў павінен закладвацца ўсё-такі ў школьным узросце. Усе выпускнікі пры паступленні павінны мець магчымасць канкурыраваць на роўных.

Таму мы прасілі і б Міністэрства адукацыі ініцыіраваць распрацоўку Палажэння аб аздараўленчай установе, на базе якой арганізуецца навучанне дзяцей і падлеткаў.

Неабходна таксама нарматыўна забяспечыць групавое аздараўленне дашкольнікаў. Пра актуальнасць гэтага пытання сведчыць тое, што ім толькі за бягучыя паўгода былі ахоплены 3 тысячы дашкольнікаў, або 19 працэнтаў ад усіх дзяцей гэтага ўзросту, што пражываюць у чарнобыльскіх раёнах, таму што ў сувязі з адсутнасцю нарматыўнай базы ўзнікае цэлы шэраг сур'ёзных супярэчнасцей.

Мы не стаім на месцы, многае робім самі. Так, рашэннем аблвыканкама сістэме адукацыі перададзены былы піянерскі летнік аб'яднання "Гомсельмаш", на базе якога ствараецца сучасны дзіцячы аздараўленчы цэнтр з сур'ёзнай лячэбнай базай і арганізацыяй вучэбнага працэсу. Нам уяўляецца, што такія ўмовы неабходна забяспечыць паўсюдна.

Здароўе дзяцей, якасць іх адукацыі напрамую залежаць ад здароўя настаўнікаў.

Сельскі настаўнік (а іх большасць у чарнобыльскіх раёнах) – гэта асаблівая катэгорыя. Бо яму даводзіцца адначасова вучыць дзяцей, працаваць на сваім участку, дапамагаць роднай гаспадарцы. Адлучыцца ён рэдка, і падлячыцца ўсё няма калі, як, зрэшты, і гарадскім настаўнікам. У дзяржаўнай праграме "Настаўнік", зацверджанай пастановай урада ад 27 лютага 1998 года, ёсць пункт аб стварэнні ў абласных цэнтрах санаторыяў-прафілакторыяў для настаўнікаў. Гомельскі аблвыканкам разумее важнасць вырашэння гэтага пытання і ідзе нам насустрач, аднак сродкаў у абласным бюджэце недастаткова. Карыстаючыся тым, што ў з'ездзе мяркуе ўзяць удзел Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь (а стала ўжо добрай традыцыяй падрыхтоўка пасля такіх падзей пратаколаў-даручэнняў кіраўніка дзяржавы), мы прасілі б уключыць у пратакол пункт аб будаўніцтве прыбудовы санаторыя-прафілакторыя з рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў.

Мы разумеем, што сродкаў катастрафічна не хапае, але вырашэнне такой важнай задачы як здароўе настаўнікаў, упэўнены, усё акупіць.

НА ЗДЫМКУ: у зале пасяджэнняў з'езда.

Фота Юрыя БОНДАРАВА.

Вадзім ШПЕТНЫ, настаўнік геаграфіі з Брэстчыны, пераможца рэспубліканскага конкурсу "Крыштальны журавель-2001":

– Прааналізаваўшы работу звычайных школ, мы будзем мець больш рэальныя ўяўленні аб ступені адпаведнасці паміж першапачатковымі мэтамі школьнай рэформы і вынікамі, якія ёсць на сённяшні дзень. З майго пункту гледжання, тыя змяненні, якія адбыліся ў школе за апошнія гады, можна лічыць станоўчымі. Безумоўна, ёсць недахопы, хочацца большага, але не ўсё адразу.

Чатыры гады, якія мінулі пасля Першага з'езда настаўнікаў, можна параўнаць з атрыманнем пачатковай адукацыі ў школе. І далей, праводзячы паралелі са школай, я канстатую, што "чытаць, пісаць і лічыць" мы навучыліся, але ў будучым нас чакае не менш напружаная праца. Роля настаўніка ў гэтым працэсе не павінна зводзіцца да крытыкі таго, што прапануецца.

Неабходна ўносіць свае канструктыўныя прапановы, якія будуць спрыяць вырашэнню пастаўленых праблем. Як гаворыцца: "Крытыкуеш – прапануй". І чым канкрэтней гучыць прапанова з гэтай трыбуны, тым яна больш рэалістычная ў пэўнай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі, тым большую каштоўнасць яна ўяўляе.

Праблемы адукацыі я параўнаў бы з экалагічнымі. Яны заўсёды былі, ёсць і будуць. Як ніхто з упэўненасцю не можа сказаць, што праз некалькі гадоў спыніцца забруджванне навакольнага асяроддзя, так ніхто не будзе сцвярджаць, што праблемы такой складанай і няслыннай у сваім развіцці сістэмы, як адукацыя, будуць вырашаны поўнасцю і ў хуткім часе. Але патрэбна праводзіць магчымыя на дадзены момант мерапрыемствы, якія дапамогуць знізіць вастрыню праблемы.

Напрыклад, такое даўняе і вострае пытанне, як ацэньваць веды, некалькі гадоў назад не мела свайго практычнага вырашэння. Але ўжо ў наступным навучальным годзе ўсе настаўнікі змогуць пераўзыйсці станоўчыя эмоцыі, якія ў іх абавязкова паявяцца ў сувязі з увядзеннем дзесяцібальнай сістэмы адзнак. Ці ўсе праблемы, звязаныя з ацэньваннем ведаў, мы вырашым такім чынам? Безумоўна, не, але павысіцца стымулюючая роля адзнакі, палепшыцца псіхалагічны клімат на ўроку, не так востра будзе стаяць пытанне другагодніцтва. А хіба гэтага мала? Вось з такіх, невялічкіх на першы погляд, пазітыўных змен і складваецца агульны поспех рэформы.

Як настаўніка сельскай школы мяне вельмі хвалюе праблема якасці адукацыі. Многімі адзначаецца, што сельская школа ў гэтым плане адстае ад гарадской. Не трэба забываць, што ў паняцце якасці адукацыі, якрамя высокага ўзроўню ведаў, неабходна ўключаць такі элемент як выхаванне. Высокаадукаваны чалавек павінен быць высокавыхаваным. А мы пра гэта часта забываем, стараючыся даць вучню як мага больш вучэбнай інфармацыі. Гэтаму ў многім спрыяе тая высокая "планка", якую неабходна пераадолець выпускніку для таго, каб стаць студэнтам. І атрымліваецца так, што вучні гарадскіх школ, ліцэяў і гімназій, якія маюць веды студэнтаў другога ці трэцяга курса, паступаюць у ВНУ, у той час як вучні сельскіх школ застаюцца за "бортам". У гэтай сувязі пытанне для роздуму: "Чаму сельскія вучні, якія паступілі ў ВНУ, у сваёй большасці хутка дасягаюць узроўню сваіх гарадскіх аднагодак і вучацца на добра і выдатна?". Адказ тут просты. Справа не толькі ў аб'ёме ведаў, якімі валодае чалавек, многае залежыць ад разумення неабходнасці пастаяннай самаадукацыі і самаўдасканалення. А разумеюць гэта, у большасці, высокавыхаваныя людзі.

Колькі слоў хочацца сказаць пра падтрымку таленавітай моладзі. Я выказваю думку многіх настаўнікаў, хто жадае захавання прадметных алімпіяд сярод школьнікаў і лічыць неабходным забяспечыць іх пераможцам магчымасці бесперашкоднага навучання ў ВНУ: гэтыя вучні – лепшыя выпускнікі школ, і яны сваёй шматгадовай працай заслугоўваюць права вучыцца далей. Ёсць такое выказванне: "Талантам надо помогать – бездарности пробьются сами". І я хачу спадзявацца, што таленавітыя вучні не будуць "абузай".

У заключэнне выкажу надзею, што ў выніку рэформы мы паступова прыйдзем да яраснай адукацыі, да адзінай школы, без прыставак "сельская" ці "гарадская", да адзінага паняцця "настаўнік Рэспублікі Беларусь". Пры важнасці розных умоў на шляху да новай адукацыі адной з галоўных з'яўляецца рэфармаванне заканадаўчай базы, унясенне дапаўненняў у Закон "Аб адукацыі у РБ" Менавіта гэта ў многім забяспечыць дастойны ўзровень жыцця настаўнікам, людзям адной з чатырох прафесій, якія ўпамінаюцца ў Свяшчэн-

Людміла ГЕПАНАВА, настаўніца рускай мовы і літаратуры гімназіі Рагачова:

— Больш за 20 гадоў я працую ў школе. Адчуваю, як імкліва яна абнаўляецца. І гэта заканамерна.

XXI стагоддзе патрабуе ад чалавека ўмення самастойна арыентавацца ў вялікай інфармацыйнай плыні, хутка і кампетэнтна вырашаць шматлікія праблемы, якія ставіць жыццё. І школа, чуйна рэагуючы на патрэбы грамадства, знаходзіцца ў пошуку. У апошнія гады ў школьную практыку актыўна ўкараняюцца новыя інфармацыйныя і развіццёвыя тэхналогіі. Склаўся такі вопыт і ў нас у раёне. Самым галоўным вынікам гэтай работы з'яўляецца тое, што дзеці становяцца іншымі: цікаўнымі, дапытлівымі, яны свабодна задаюць пытанні і з задавальненнем шукаюць на іх адказы.

Мяне як настаўніка рускай мовы і літаратуры асабліва радуе тое, што дзецям на ўроках камфортна, яны вучацца з радасцю, і спасціжэнне нават "цяжкіх" арфаграм становіцца для іх цікавым.

Мы падтрымліваем скіраванасць Міністэрства адукацыі і Нацыянальнага інстытута на шырокую эксперыментальную дзейнасць па ўкараненні новых педагагічных тэхналогій. Разлічваем на тое, што гэта – не даніна модзе, а ўстойлівая тэндэнцыя, якая прывядзе да абнаўлення не толькі зместу, але і метадаў навучання.

Безумоўна, ёсць і пэўныя цяжкасці ў нашай рабоце. Але мы цудоўна разумеем, што без іх такую вялікую справу як рэфармаванне адукацыі, абнаўленне школы рабіць немагчыма. Цяжкасці можна пераадолець, а ў недалёкай будучыні паявяцца і неабходныя падручнікі па развіццёвым навучанні, і праграмы, і метадычныя дапаможнікі.

А сельская школа? Яе праблемы нікога не могуць пакінуць абыякавым.

Безумоўна, менавіта яна ў вялікай ступені можа зарыентаваць вучняў на прафесіі, неабходныя сельскай гаспадарцы. У вобласці адкрываюцца аграрныя класы. Абласным выканаўчым камітэтам перад намі пастаўлена задача стварыць іх у кожным раёне. Ёсць ужо і пэўная нарматыўная база для вырашэння гэтай задачы. Хацелася б прасіць Міністэрства адукацыі яе пашырыць, патрэбна палажэнне аб сельскім сацыяльна-педагагічным комплексе, аграшколе. Гэта дазволіць у бліжэйшыя гады больш актыўна вырашаць пытанні забеспячэння сяла спецыялістамі.

І яшчэ адну праблему, якая мяне вельмі хвалюе, хачу вынесці на абмеркаванне ўсіх прысутных.

Я, як і большасць настаўнікаў-прадметнікаў, з'яўляюся класным кіраўніком. Часта думаю пра тое, што гэтая работа, якая фармальна ацэньваецца дзвюма гадзінамі на тыдзень, вымагае ад мяне больш сіл, душы, чым 18 гадзін урочнай дзейнасці. І не выпадкова. Які настаўнік можа заставацца спакойным, калі ў яго класе за партамі сядзяць дзеці, якія з'яўляюцца сіротамі пры жывых бацьках, якія рана адчулі жорсткасць і спазналі адсутнасць чалавечага цяпла? Добра, што дзяржава не застаецца безуважнай да іх лёсаў. Рэалізуецца праграма "Дзеці Беларусі". Ствараецца сетка сацыяльных інстытутаў. Але ўсё гэта не можа замяніць чалавечых узаемін. Часам падлетак у цяжкую для яго хвіліну застаецца адзін на адзін са сваімі праблемамі. А як неабходны яму ў такі момант парада і дапамога дарослага чалавека! Але класны кіраўнік, які заклікан па абавязку сваёй службы дапамагчы дзіцяці, далёка не заўсёды аказваецца побач. І не таму, што не жадае...

На нашу думку, калі мы хочам вырашыць падобныя праблемы, а таксама арганізаваць нармальны выхаваўчы працэс у дзіцячых калектывах, неабходна, каб класны кіраўнік выконваў толькі гэтую работу або быў вызвалены. Звярнуўшыся да вопыту такой работы ў прафесійна-тэхнічных вучылішчах, іншых навучальных установах, бачым, што становішча ў арганізацыі выхаваўчай работы кардынальна мяняецца ў лепшы бок.

Упэўнена, што любыя затраты дзяржавы будуць апраўданы, калі за імі – фізічнае і духоўнае здароўе дзіцяці.

Паважаныя калегі! Тое, што сёння мы сабраліся ў гэтай зале ў прысутнасці кіраўнікоў нашай дзяржавы, органаў адукацыі абмеркаваць набалелыя пытанні, дае надзею на іх вырашэнне. Ну, а наша задача – працаваць так, каб новае пакаленне годна прыняло эстафету кіравання і было не толькі таленавіт

З выступленняў дэлегатаў II з'езда настаўнікаў

Галіна ШМЯЛЁВА, загадчыца аддзела адукацыі Слонімскага раённага выканаўчага камітэта:

— На гэты з'езд мяне дэлегавала сельскае настаўніцтва, і хочацца верыць, што калектыўная думка ўдзельнікаў форуму вызначыць далейшыя шляхі дзяржаўнай стратэгіі ў сферы адукацыі.

Яшчэ ў канцы 80-х гадоў на базе нашага раёна быў праведзены і атрымаў станоўчую ацэнку эксперымент па развіцці дыферэнцыраванага навучання ў сельскай малакамплектнай школе. Прыемна ўсведамляць, што тая эксперыментальная работа стымулявала паяўленне розных варыянтаў вучэбных планаў. Тады былі практычна апрабіраваны механізмы індывідуальнага навучання ў сельскай школе. Аднак сённяшнія вучэбныя планы не ўлічваюць спецыфіку малакамплектнасці. Пры ўсёй сваёй разнастайнасці яны аднолькавыя як для сельскіх, так і для гарадскіх школ. А нас гэта не задавальняе.

Сёння мы чакаем:

– удакладнення, дапрацоўкі палажэння аб ліцэйскіх і гімназічных класах з улікам умоў сельскай малакамплектнай школы, што дазволіла б паглыбіць работу з адоранымі школьнікамі на сяле;

– ва ўмовах агульнаадукацыйнай школы нам неабходны новыя дакументы, якія дазваляюць шырока прымяняць індывідуальныя адукацыйныя траекторыі;

– неабходны індывідуальныя вучэбныя планы з рознымі тэрмінамі навучання і спецыяльныя планы для малакамплектнай школы;

– нельга абысці ўвагай і павелічэнне попыту на спецыяльныя адукацыйныя паслугі. На жаль, ёсць праблема захавання генафонду – з-за п'янства бацькоў. Павышаецца колькасць дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Таму трэба ўнесці карэктывы ў вучэбныя планы і праграмы для навучання гэтых дзяцей у малакамплектнай школе, што павінна быць замацавана нарматыўна.

Пазітыўна ацэньваючы зробленае ў перыяд паміж з'ездамі, хочацца вызначыць і такія пытанні, якія патрабуюць дадатковых мер: дзяржаўная праграма "Сельская школа" не забяспечана належным чынам матэрыяльнымі рэсурсамі, нарматыўнымі дакументамі. Пры фарміраванні бюджэту варта падумаць пра мэтавае фінансаванне гэтай праграмы з улікам аб'ектыўнай патрэбы ў мадэрнізацыі вучэбна-матэрыяльнай базы ўстаноў адукацыі ў сельскай мясцовасці. Агульнавядома, наколькі вострая праблема камп'ютэрызацыі вучэбна-выхаваўчага працэсу, і хоць мы імкнемся ўкараняць інфармацыйныя тэхналогіі, выкарыстоўваем камп'ютэр для карэкцыі ведаў вучняў, адсталая тэхнічная база тармозіць гэты працэс. Пры цяперашніх тэмпах інфарматызацыі адукацыі нам спатрэбіцца, напэўна, 100 гадоў, пакуль кожнае вясковае дзіця ўбачыць сучасны камп'ютэр. Магчыма, трэба ствараць умовы для льготнага набыцця камп'ютэрнай тэхнікі: крэдытаванне, зніжэнне падаткаў, вызваленне ад мытных пошлін.

Разумеючы шматаспектнасць выхаваўчага працэсу, хачу звярнуць увагу на нявыкарыстаныя магчымасці сельскіх дамоў культуры і іншых устаноў сацыякультурнай сферы. Нярэдка гурткі і секцыі дубліруюцца, вядуцца непрафесійна. Хацелася б, каб у папраўках да Закона "Аб адукацыі" была больш дакладна вызначана адказнасць усіх удзельнікаў працэсу выхавання за арганізацыю работы з дзецьмі і падлеткамі па месцы жыхарства. Бо выхаванне асобы – праблема агульнадзяржаўная, а не вузкапедагагічная, і нельга яе перакладваць выключна на школу. Мы даўно чакаем заканадаўчага ўзмацнення адказнасці сям'і за выхаванне дзяцей, таму што сацыяльнае сіроцтва мае пагражальную тэндэнцыю росту, і ўсё гэта кладзецца на плечы дзяржавы. Напэўна, час падумаць пра тое, што бацькоў, якія кідаюць дзяцей, трэба караць рублём, а не ўгаворамі прыводзіць да роздуму.

Пра значнасць ролі і месца настаўніка ў якасным абнаўленні нацыянальнай сістэмы адукацыі сказана дастаткова. Звярну ўвагу на тое, што працэс павышэння прафесіяналізму, майстэрства педкалектываў патрабуе кампетэнтнага кіравання. Аднак пры сённяшніх умовах аплаты працы метадыстаў, інспектараў укамплектаваць штаты аддзелаў і ўпраўленняў адукацыі лепшымі спецыялістамі надзвычай складана. Між тым, укараненне новага зместу і структуры адукацыі, развіццё новых тыпаў навучальных устаноў і іншыя якасныя зрухі ў сістэме адукацыі патрабуюць высокай кваліфікацыі кіраўнікоў і метадыстаў. Неабходна прывесці да адзінай роўніцы зарплаты метадыстаў і інспектараў. Адна з маіх супрацоўніц, якая адпрацавала інспектарам больш за 20 гадоў, ідзе на заслужаны адпачынак з пенсіяй у 51 тысячу рублёў. Гэта ненармальна. Ці прыйшло б каму-небудзь у галаву адабраць скальпель у хірурга? А ў інспектара, які павінен кантраляваць якасць кожнага ўрока, аднялі магчымасць весці ўрокі, тым самым пазбавіўшы яго прафесійнага інструментарыя. Лічу гэтую забарону не да канца прадуманай. Пара зразумець, што выкладанне для школьнага інспектара – неабходны складнік яго прафесіяналізму. Спадзяемся на разуменне ўрада ў вырашэнні гэтай праблемы.

Увядзенне ў штатны расклад малакамплектных школ па 0,5 стаўкі псіхолагаў, сацыяльных педагогаў, дэфектолагаў не дазваляе поўнасцю зняць праблему іх неабходнасці і эфектыўнага выкарыстання. Па-першае, не хапае саміх спецыялістаў, па-другое, няма жадаючых працаваць на паўстаўкі. Відавочна неабходнасць перагляду норм вучэбнай нагрузкі гэтай катэгорыі работнікаў і ўмоў аплаты іх працы ў горадзе і на сяле. Гэта ж датычыць і намеснікаў дырэктараў па вучэбна-выхаваўчай рабоце.

Сумная рэалія нашага часу – змяншэнне дзіцячага кантынгенту. Гэта абумоўлівае неабходнасць вырашэння праблем перападрыхтоўкі і працаўладкавання свабодных педагагічных кадраў, з аднаго боку, з другога – указвае на патрэбу змянення нарматываў вучэбнай нагрузкі настаўніка і напаўняльнасці класаў-камплектаў. Пакуль у вёсцы ёсць школа – жывая і сама вёска. Думаецца, што пры вырашэнні пытанняў пра сетку ўстаноў адукацыі павінны пераважаць інтарэсы дзіцяці, сям'і, а не эканамічныя разлікі.

Уладзімір ШЫЦЬКО, дырэктар Лужаснянскай школы-інтэрната-гімназіі для здольных і таленавітых дзяцей Віцебскай вобласці:

– У рэформе сістэмы адукацыі значнае месца адводзіцца сельскай школе. Праблема сельскай школы на сучасным этапе стаіць даволі востра. Назіраецца вялікая розніца паміж вучнем гарадской і вучнем сельскай школы.

У Віцебскай вобласці шмат чаго робіцца, каб выправіць гэтае становішча. Прыкладам з'яўляецца дзейнасць Лужаснянскай школы-інтэрната-гімназіі для здольных і таленавітых дзяцей-сірот і дзяцей з малазабяспечаных сем'яў з сельскай мясцовасці Віцебскай вобласці. Будучы вясковай вучэбна-выхаваўчай установай, школа закладвае падмурак фарміравання эліты для беларускай вёскі, што асабліва неабходна ў сучасных умовах. Мы даём магчымасць найбольш таленавітым дзецям атрымаць сярэднюю адукацыю з улікам іх жаданняў і патрэб.

Тое, што вучні знаходзяцца ў гімназіі на працягу амаль усяго актыўнага часу, дапамагае настаўнікам больш эфектыўна працаваць з імі, удасканальваць іх уменні і навыкі, фарміраваць маральныя якасці. Добрая навучальная і матэрыяльная база гімназіі, а таксама камфортныя ўмовы, набліжаныя да хатніх, медыцынскае абслугоўванне, дапамога псіхолага, магчымасць займацца ў розных гуртках, факультатывах, спартыўных секцыях – усё гэта спрыяе максімальнаму развіццю здольнасцей нашых вучняў.

Школа-інтэрнат-гімназія – мнагапрофільная. Кожны выбірае сабе справу па душы. Усё гэта дае добрыя вынікі. За некалькі апошніх гадоў мы падрыхтавалі 61 пераможцу і прызёра рэспубліканскіх, 5 – міжнародных алімпіяд.

У добрых умовах вясковыя дзеці могуць дасягнуць значна большага – з улікам сваёй працавітасці, прыроднай кемлівасці, дабрыні, адкрытасці – і па канчатковых выніках пераўзыходзіць сваіх гарадскіх аднагодкаў.

Хвалюе праблема невялікіх сельскіх школ. У нас на Віцебшчыне іх вельмі шмат. На іх утрыманне ідуць вялікія грошы, а стварыць сучасныя ўмовы для навучання ў гэтых школах не маем магчымасці. Думаю, што ў кожным раёне неабходна акрэсліць апорныя сярэднія ці базавыя школы, наладзіць сістэму падвозу і харчавання вучняў. Эканомія сродкаў ад закрыцця такіх школ дазволіць накіраваць іх на пакупку школьных аўтобусаў і на іх утрыманне, а таксама лепш абсталяваць апорныя школы. Прыклады такога падыходу ёсць у Расіі – Самарская вобласць, дзе ад слоў перайшлі да справы.

У адукацыі даўно наспелі перамены. Нашы дзеці атрымліваюць многа інфармацыі па тэлебачанні, радыё, праз друк. Традыцыйнымі ўрокамі іх ужо не зацікавіць. Вучням мала атрымліваць веды са слоў настаўніка, ім хочацца самім рабіць адкрыцці, удзельнічаць у эксперыментах, праводзіць доследы, таму неабходна падтрымліваць ідэю сістэмы развіццёвага навучання, якая дапамагае вучню праявіцца як асобе.

Вучань – галоўная фігура ў школьнай установе, а таму ўсе і ўсё павінна служыць на карысць яму, на развіццё яго творчасці, здольнасцей, таленту, на выхаванне годнага грамадзяніна сваёй дзяржавы. Даўно трэба прызнаць школу няхай не матэрыяльнай, але вытворчасцю – вытворчасцю самага галоўнага: чалавечай асобы. Няхай наш урад, вызначаючы бюджэтныя выдаткі, не паскупіцца на заработную плату настаўніку, на ўкараненне новых тэхналогій і на іншыя патрэбы школы. Гэта абавязкова акупіцца.

Неабходна даць больш свабоды школьным калектывам, якія могуць і жадаюць працаваць. Акрамя таго што вучым і выхоўваем, вялікую ўвагу мы надаём удасканаленню матэрыяльнай базы школы-інтэрната. Зараз у нашым распараджэнні знаходзіцца 12 гектараў зямлі, сад, дзве зімовыя цяпліцы, свінаферма на 100 галоў, неабходная тэхніка і іншае. Гэта дазваляе забяспечваць вучняў гароднінай, садавінай, мясам. Толькі сёлета мы зарабілі каля 15 мільёнаў рублёў, якія выкарысталі на ўдасканаленне вучэбна-матэрыяльнай базы школы. Можна было б працаваць лепш і дасягнуць большага. Што перашкаджае? Скажу шчыра – замучылі праверкі. Па некалькі разоў у год месяцамі сядзяць рэвізоры. У нашым калектыве дзейнічае прынцып: не крадзі – і баяцца нікога не трэба. Але столькі ўсялякіх нарматыўных актаў, якія часам супярэчаць адзін аднаму, што нехаця іх парушыш. Рэвізоры мне часам шчыра кажуць – лепш нічога не рабіць, тады і парушэнняў не будзе. У чымсьці яны маюць рацыю, ды сумленне не дазваляе. Я ж нясу адказнасць за школу, за дзяцей, якіх трэба не толькі навучыць, але і накарміць, спаць пакласці.

Многія праблемы школы – праблемы нашага грамадства. Але менш слоў – больш канкрэтных спраў. Вельмі многае залежыць і ад нас саміх.

Алена ГАЙЛО, загадчыца ясляў-сада № 54 Гродна:

— Сёння ў рэспубліцы больш як 70 працэнтаў дзяцей наведвае дашкольныя ўстановы розных відаў, тыпаў, профіляў.

Мы паспяхова вырашаем задачу падрыхтоўкі да школы дзяцей пяці гадоў. У бягучым навучальным годзе ў гарадах Гродзенскай вобласці плануецца ўсіх дзяцей гэтага ўзросту прыняць у дашкольныя ўстановы.

Правільнай стратэгіяй і тактыкай стала арганізацыя работы падрыхтоўчых класаў на базе дашкольных устаноў. У дзіцячых садах Ленінскага раёна Гродна размешчаны ўсе 63 падрыхтоўчыя класы.

Чатыры гады работы з дзецьмі-шасцігодкамі ў дашкольных установах пераканалі, што мы прадоўжылі ім дзяцінства, дапамаглі не на словах, а на справе ўстанавіць пераемнасць сямейнага выхавання, дашкольнай і пачатковай адукацыі.

Вызначаная ўрадам невысокая плата за наведванне дзіцем дзіцячага сада зрабіла дашкольную ўстанову даступнай для кожнай сям'і. Думаецца, што гэты механізм аплаты трэба захаваць.

Мой дзіцячы сад, як і іншыя, сёння знаходзіцца ў працэсе пераходу на новыя педагагічныя тэхналогіі. Я сама маці, і таму мне асабліва блізкія тэхналогіі па фарміраванні здаровага ладу жыцця дзяцей.

У нашым раёне гэта дазволіла значна знізіць захворванне дзяцей. За 2000 год паказчык дзён, прапушчаных адным дзіцем у год з-за хваробы, склаў у нас 7,3 дня (у цэлым па вобласці – 8, у рэспубліцы – 11 дзён). Калі кожны калектыў будзе штодзень клапаціцца пра зніжэнне колькасці хворых дзяцей – гэта і будзе самы лепшы ўклад у будучыню нацыі.

Павышэнню выніковасці нашай работы садзейнічала і ўвядзенне ў штатны расклад педагогаў-псіхолагаў, медыцынскіх сясцёр па дыетахарчаванні, кіраўнікоў фізвыхавання.

Разам з тым існуюць праблемы ў арганізацыі харчавання дашкольнікаў. Дагэтуль не пераадолена неадпаведнасць паміж натуральнымі і грашовымі нормамі на харчаванне – гэтае пытанне трэба вырашаць. Чакаем таксама канкрэтнага рашэння аб увядзенні пасады тэхнолага па харчаванні дашкольнікаў.

Адно з галоўных пытанняў на парадку дня – павышэнне значнасці працы педагога дашкольнай установы. Мы з калегамі лічым неабходным перайменаванне пасады "выхавальнік" у пасаду "настаўнік, які выхоўвае і навучае дзяцей дашкольнага ўзросту", як гэта зроблена ў многіх краінах. Тым самым мы зможам ліквідаваць існуючую розніцу ў аплаце працы і працягласці рабочага тыдня.

Нельга не закрануць і нарматыўнага фінансавання дашкольных устаноў. На працягу апошніх 10 гадоў для нас стала раскошай набыццё інвентару, не кажучы ўжо пра цацкі. А выхад са строю тэхналагічнага абсталявання з'яўляецца пастаяннай бядой для дашкольных устаноў.

Лічу, што пры сённяшнім фінансавым становішчы дзяржаўны бюджэт не можа і не павінен браць на сябе расходы па ўтрымканні ведамасных дашкольных устаноў. Для іх падтрымкі прапаную, каб была вернута ранейшая практыка пазабюджэтнага фонду або мэтавага збору на ўтрыманне ведамасных дашкольных устаноў, якая часткова вырашала пытанні ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Разам з тым прыемна адзначыць, што, нягледзячы на нашы цяжкасці, дашкольная адукацыя на Беларусі прызнана адной з лепшых у свеце.

Хацелася б выказаць надзею, што праблемы дзяцінства будуць успрымацца як праблемы дзяржаўнай важнасці.

Вольга ЛУГОЎСКАЯ, настаўнік-дэфектолаг Кадзінскай сярэдняй школы Магілёўскага раёна:

— Заключэнне аб асаблівасцях псіхафізічнага развіцця дзіцяці папярэджвае нас: гэтаму дзіцяці патрабуюцца асаблівыя метады навучання і выхавання. Радуе, што ў міжз'ездаўскі перыяд наша грамадства і ўрад загаварылі аб праблеме дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і зроблены ўжо канкрэтныя захады для яе вырашэння.

Можна гаварыць, што сёння ў рэспубліцы створана сістэма спецыяльнай адукацыі для дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці.

Выхаванне такіх дзяцей можа ажыццяўляцца не толькі ў спецыяльных дашкольных установах, але і ў спецыяльных групах пры дзіцячых садах агульнага тыпу. Для дзяцей школьнага ўзросту стаў магчымы выбар: не толькі спецыяльная група або школа-інтэрнат, навучанне дома, але і спецыяльны клас або клас інтэграванага навучання ў агульнаадукацыйнай школе, а таксама наведванне адкрытых за апошнія гады пунктаў карэкцыйна-педагагічнай дапамогі. Стала магчымай і якасная прафесійная падрыхтоўка падлеткаў з асаблівасцямі ў развіцці.

Я – настаўнік-дэфектолаг у класе інтэграванага навучання сельскай школы. І як спецыяліст не магу пагадзіцца з выказваннямі накшталт: "А навошта на гэтых дзяцей траціць такія сродкі, ёсць спецшколы, няхай там і вучацца. Ды і дзіцяці такому сярод роўных прасцей". Можа, і прасцей, але ж яму ўсё роўна трэба ўлівацца ў наша грамадства, знайсці сваё месца ў ім і пабудаваць паўнацэннае дарослае жыццё. І чым пазней гэта будзе адбывацца, тым цяжэй будзе для дзіцяці і для акружэння.

Вядома, калі дзіця знаходзіцца ў неспрыяльных умовах і сацыяльная сітуацыя аказвае на яго негатыўны ўплыў, пажадана аддаць яго ў інтэрнацкую ўстанову. Калі ж умовы ў сям'і нармальныя, прыярытэтным з'яўляецца навучанне ў масавай школе па месцы жыхарства. Толькі ў бацькоўскім доме дзіця жыве поўным жыццём, а не рыхтуецца да яго.

Зразумела, што пры адкрыцці класаў інтэграванага навучання ўзнікае шмат праблем. І адна з іх (як ні парадаксальна!) – бацькі. Некаторыя з іх гатовы ператварыць гады вучобы дзіцяці ў гады пакут, толькі б не было дыягназу "затрымка псіхічнага развіцця". Хоць гэта зусім не кляймо, якое застаецца з дзіцем на ўсё жыццё. У нашай школе тры гады працаваў клас інтэграванага навучання, дзе вучыліся дзеці з дыягназам "затрымка псіхічнага развіцця" і іншымі спадарожнымі дыягназамі. Вынікі абследавання ў гэтым годзе паказваюць нармальнае развіццё інтэлекту ў дзяцей, і ўсе яны вучацца дастатковa паспяхова ў звычайным пятым класе. Але больш за ўсё мяне радуе тое, што мае вучні не пачуваюць сябе сярод равеснікаў ізгоямі, яны свабодныя, раскаваныя, упэўненыя ў сабе.

З боку іншых бацькоў часам можна пачуць: "Чаму гэта мой такі разумны павінен вучыцца з такімі?.."

Вопыт інтэграванага навучання пераканаўча паказвае: рознаўзроўневыя ўзаемліны карысныя для ўсіх вучняў класа. Асаблівасці ўспрымання, арыгінальнасць мыслення праблемных дзяцей павышаюць творчы патэнцыял класа. У такім класе больш магчымасцей для становучага самасцвярджэння сарамлівых дзяцей, выхавання культуры ўзаемін і г.д.

Пералічэнне пераваг можа быць тэмай спецыяльнай размовы, у тым ліку і на бацькоўскім сходзе, а таксама ў сродках масавай інфармацыі.

Што яшчэ хвалюе? Недастатковае рэсурснае забеспячэнне.

Настаўніку-дэфектолагу проста неабходны камп'ютэр з адпаведным праграмным забеспячэннем, якое сёння ўжо існуе і рэкамендавана Міністэрствам адукацыі да выкарыстання ў працы. Вельмі патрэбны слыхавыя апараты і гукаўзмацняльная апаратура, абсталяванне для навучання чытанню і пісьму па Брайлю і проста цацкі, разнастайныя канструктары.

Асноўныя дыдактычныя і карэкцыйныя матэрыялы настаўнік робіць сам, але тое, што я назвала, зрабіць настаўніцкімі рукамі немагчыма. І, карыстаючыся прысутнасцю на з'ездзе членаў урада, кіраўніцтва абласцей і раёнаў, хачу папрасіць, зацвярджаючы аб'ёмы фінансавання на наступныя гады, прадугледжваць мэтавыя сродкі на набыццё спецыяльнага абсталявання і матэрыялаў для работы з дзецьмі з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

Тэлепраграма

ПАНЯДЗЕЛАК, 12 ЛІСТАПАДА БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.30, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.30 Навіны.
9.15 «Краіны свету». Ліван.
10.05, 17.00 «Страсці».
10.55 Тэлебарометр.
11.10, 21.45 «Чалавек мора».
12.15 «Час мясцовы».
12.40 Арсенал.
13.05 «Загадкі майстра». Праграма, прысвечаная творчасці народнага артыста СССР дырыжора Віктара Роўды.
13.45 «Цені знікаюць апоўдні». Маст. фільм. 3-я серыя.
15.15 «Жулі Леско».
18.20 Зона Ікс.
18.30 Дэтэктыў «Генерал».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
22.35 Стадыён.
23.00 Планета «АРТ».

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00 Навіны.
8.15, 18.00 «Зямля кахання».
9.10 «Каменская: Не перашкаджайце палачу». 1-я серыя.
10.15 Дак. дэтэктыў «Шайка для міністра». Справа 2000 года. Частка 1-я.
10.45 «Ералаш».
10.50 Бібліяманія.
14.15 Магчыма ўсё.
14.35 Зорная гадзіна.
15.00 «Вечны кліч».
16.00 Вялікае мыццё.
17.00 Вячэрнія навіны.
17.25 «З лёгкай парай!».
19.00 Чакай мяне.
20.00 Час.
20.35 Камедыя «Наступны». 1-я серыя.
21.40 Незалежнае расследаванне.
22.30 Начны «Час».
23.00 «На футболе».
23.30 «Начная змена».

РАСІЯ

4.50, 5.50, 6.50, 7.50 Весткі—Масква.
5.00, 6.00, 7.00, 8.00 Весткі.
5.15 «Селеста, заўсёды Селеста». Тэлесерыял.
5.45 Праваслаўны каляндар.
6.15 «Тэлепузікі».
6.40 Сямейныя навіны.
7.15 Экспертыза РТР.
7.30 Масква—Мінск.
8.15 Тэлесерыял «Маскоўскія вокны».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.30 «Санта-Барбара».
11.30 Весткі тыдня.
12.30 «Што хоча жанчына». Ток-шоу з Кларай Новікавай і Аленай Якаўлевай.
13.30 Прэм'ера. «Крылы кахання». Тэлесерыял.
14.20 «Дзікі анёл».
15.20 Прэм'ера. «FM і дзеці». Маладзёжны серыял.
16.30 Камедыя «Яна вас кахае».
18.00 «Маскоўскія вокны».
19.35 Мясцовы час. Весткі—Масква.
19.55 Дэтэктыў «Пуаро Агаты Крысці. Лічылка».
22.00 Весткі+падрабязнасці.
22.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
22.45 Дзяжурная часць.
23.00 Вострасюжэтны фільм «Перахватчыкі».

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.05 Сёння.
5.10, 6.20, 7.55, 13.25, 17.40 Крымінал.
5.20, 7.15 У запас.
5.35, 6.40, 13.40 Афіша.
5.40, 7.25 Нашы любімыя жывёлы.
5.45, 6.45, 7.45 Пяць хвілін з Наважонавым.
5.50, 6.50 Вялікія грошы.
6.35, 7.40 Карданны вал.
8.25 Служба выратавання.
9.30 Надоечы.
10.40 Лялькі.
11.25 Дэтэктыў «Паліцэйскія». 1-я серыя.
13.50 Серыял «Графіня дэ Мансаро».
15.30 Серыял «Салон прыгажосці».
16.35, 18.55 Серыял «Дзень нараджэння Буржуя-2».
18.35 Герой дня.
20.00 Сквапнасць.
21.55 «Хуткая дапамога».
23.30 Гардон.

КУЛЬТУРА

7.05, 11.30, 15.00, 17.30, 23.00 Навіны культуры.
7.30 «Афера Цэпліса». Маст. фільм.
9.15 «Бясконцая гісторыя Галівуда».
9.40 «Побач з рэстаўратарам». «Лік (Іканапісец)». Дак. фільмы.
10.20 Л. Дзесятнікаў. «Як стары шарманшчык».
10.35 Сферы.
11.45 «Добрай раніцы. «Маст. фільм.
13.10 «Вяртанне з Алімпа». Мультфільм.
13.30 Разам з Фафалем.
13.45 Усе суры Карана.
14.05 Жывое дрэва рамёстваў.
14.15 Архітэктурная галерэя.
14.30 «Асеннія партрэты».
15.10 «Гатовыя ці не». Серыял.
15.35 Крыштальны камертон.
16.30 Alma mater.
17.00 Археалогія.
17.50 «Век Рускага музея».
18.15, 20.20 «Дзядзькін сон». Спектакль.
20.05 Добрай ночы, малышы!
21.35 «Што рабіць?».
22.30 Ад кінаавангарда да відэаарта.

ТБ 6

5.45, 14.35, 17.40, 23.30 Дарожны патруль.
6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Цяпер.
6.10, 6.40, 7.10, 7.35 Дзень за днём.
7.50 Назлосць.
8.25, 10.25 Серыял «Тайны следства».
9.25 «Усяго».
11.25 «Усе ў сад!».
12.20, 14.25 Тэлемагазін у Мінску.
13.20, 17.05, 22.40 «За шклом».
14.55 100 цудаў свету.
16.30 «Самыя гучныя злачынствы XX стагоддзя».
18.45 «Тайны следства».
20.30 Тушыце святло.
20.50 «Забыты полк».
22.00 Межы.

СТБ

6.00 «Ікс-мэн».
6.30 «Шкадлівая сабака».
7.00 «Таямнічыя рыцары Цір На Ног». 7.30 «Мурашкі».
8.00 «168 гадзін Мінска».
8.50 «Віртуальны свет».
9.00 Баявік «Кікбаксёр-4: Агрэсар».
11.00 Клуб «Белы папугай».
11.30 «Дыскаверы» на СТБ.
12.00, 15.00, 18.00 Навіны СТБ.
12.15 «Выпадковы сведка».
12.45, 13.55 «Дальнабойшчыкі».
15.15 Кулінарныя рэцэпты ад рэстарана «Лясны».
15.30 «Мурашкі».
16.00 «Шкадлівы сабака».
16.30 «Ікс-мэн».
16.55 «Чарцяня».
18.15 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
18.30 «Дыскаверы» на СТБ.
19.00 «Тэма дня». Аўтарская праграма Сяргея Вінаградава.
19.10 «Прэм'ер-парад. Сталічны». Гумарыстычная праграма.
19.15 «Вечарніца».
19.30 Фільм жахаў «Павукі-2».
21.40 «Пяты вугал». Серыял.
23.00 «Навіны СТБ—24 гадзіны».
23.30 «Віртуальны свет».
23.45 «Тэлетузікі».
0.00 Футбольны кур'ер.
0.30 «Начная размова з Аляксеем Лушніковым».

АЎТОРАК, 13 ЛІСТАПАДА БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

15.00, 18.00, 0.35 Навіны.
15.15 «Дэні, раскажы мне гісторыю».
15.25 «Усе на арбіту!».
15.35 «Маленькія Эйнштэйны».
16.10 «Пяць цудаў».
16.20 «5 х 5».
17.00 «Страсці».
18.20 Зона Ікс.
18.30 «Масква—Мінск».
18.45 «Дзеці на дрэвах». Маст. фільм.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.45 Фантастычны баявік «Тэрмінатар-2. Судны дзень».
24.00 Спорт-кур'ер.
0.10 Ток шоу «Справы жыццёвыя».

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00 Навіны.
8.15, 18.00 «Зямля кахання».
9.15 «Наступны». 1-я серыя.
10.20 «З лёгкай парай!».
10.50 Бібліяманія.
14.15 Ці грэх — ці два.
14.35 Цар гары.
15.00 «Вечны кліч».
16.00 Вялікае мыццё.
17.00 Вячэрнія навіны.
17.25 «Паскораная дапамога».
19.00 «Слабае звяно».
20.00 Час.
20.35 «Наступны». 2-я серыя.
21.40 Крэмль-9. «Галоўны бастыён». 1-я серыя.
22.30 Начны «Час».
23.00 Цывілізацыя.
23.30 «Начная змена».

РАСІЯ

4.50, 5.50, 6.50, 7.50 Весткі—Масква.
5.00, 6.00, 7.00, 8.00,10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Весткі.
5.15 «Селеста, заўсёды Селеста». Тэлесерыял.
5.45 Праваслаўны каляндар.
6.15 «Тэлепузікі».
6.40 Сямейныя навіны.
7.15 Экспертыза РТР.
7.30 Нацыянальны даход.
7.35 Дзяжурная часць.
8.15 «Маскоўскія вокны».
10.30 «Санта-Барбара».
11.30 Ток-шоу Таццяны Ведзянеевай «Побач з табой».
12.30 «Што хоча жанчына». Ток-шоу з Кларай Новікавай і Аленай Якаўлевай.
13.30 Прэм'ера. «Крылы кахання». Тэлесерыял.
14.20 «Дзікі анёл».
15.20 Прэм'ера. «Простыя ісціны». Тэлесерыял.
16.30 Камедыя «Раз на раз не прыходзіцца».
18.00 «Маскоўскія вокны».
19.35 Мясцовы час. Весткі—Масква.
19.55 Дэтэктыў «Марасейка. 2. Бывай, паліцэйскі».
22.00 Весткі+Падрабязнасці.
22.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
22.45 «Тэракты ў Амерыцы: пошукі прычын». Дак. фільм (ЗША).
23.40 Камедыя «Салодкі і гадкі».

НТБ

5.00, 5.30, 6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 9.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00, 23.05 Сёння.
5.10, 6.20, 13.30, 17.40 Крымінал.
5.20, 7.15 У запас.
5.35, 6.40, 13.40 Афіша.
5.40, 7.25 Нашы любімыя жывёлы.
5.45, 6.45, 7.45 Пяць хвілін з Наважонавым.
5.50, 6.50 Вялікія грошы.
6.35, 7.40 Карданны вал.
8.25 «Хуткая дапамога».
9.25, 20.00 Сквапнасць.
10.10 Шоу Алены Сцепаненка.
11.25 Дэтэктыў «Паліцэйскія». 2-я серыя.
13.50 Серыял «Графіня дэ Мансаро».
15.30 Серыял «Салон прыгажосці».
16.35, 18.55 Серыял «Дзень нараджэння Буржуя-2».
18.35 Герой дня.
23.30 Гардон.

КУЛЬТУРА

7.05, 11.30, 15.00, 17.30, 23.00 Навіны культуры.
7.30 «Габсек». Маст. фільм.
9.15 Залаты п'едэстал».
9.40, 15.35 Дак. экран.
11.40 «Пакліч мяне ў далячынь светлую». Маст. фільм.
13.30 Разам з Фафалем.
13.45 Справа жыццёвая.
14.15 Улада факта.
14.30 Сцэнаграма.
15.10 «Гатовыя ці не». Серыял.
16.30 «Расійскі кур'ер».
17.00 Археалогія.
17.50 Палацавыя тайны.
18.15 «Будэнброкі». Серыял.
19.15 Партрэты мастакоў.
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 «Трынаццаць плюс». Акадэмік Мікалай Сямёнаў.
20.40 «Смяльчак». Маст. фільм.
22.30 Форма.

ТБ 6

5.45, 14.35, 17.40, 0.25 Дарожны патруль.
6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 10.00, 12.00, 14.00, 16.00, 18.00, 20.00 Цяпер.
6.10, 6.40, 7.10 Дзень за днём.
7.40, 20.35 Тушыце святло.
7.50 Назлосць.
8.25, 18.45 Серыял «Тайны следства».
9.25 «Без гальштука».
10.25 «Забыты полк».
11.25 Катастрофы тыдня.
12.20, 14.25 Тэлемагазін у Мінску.
13.15, 17.05, 22.40 «За шклом».
14.55 100 цудаў свету.
16.30 «Самыя гучныя злачынствы XX стагоддзя».
20.50 «Вуліцы разбітых ліхтароў II».
22.00 Межы.
23.30 «Без пратакола».

СТБ

6.00 «Ікс-мэн».
6.30 «Шкадлівы сабака».
7.00 «Таямнічыя рыцары Цір На Ног».
7.30 «Мурашкі».
8.00 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
8.15 Навіны СНД.
8.30 «Аўтапанарама».
8.45 «Прэм'ер-парад «Сталічны».
8.50 «Віртуальны свет».
9.00 Фільм жахаў «Павукі-2».
11.30 «Перакрыжаванне».
12.00, 15.00, 18.00 Навіны СТБ.
12.15 «Выпадковы сведка».
12.45 «Пяты вугал».
14.00 «Сакрэтныя матэрыялы».
15.15 Кулінарныя рэцэпты ад рэстарана «Лясны».
15.30 «Мурашкі».
16.00 «Шкадлівы сабака».
16.30 «Ікс-мэн».
16.55 «Чарцяня».
18.15 Міжнародныя спартыўныя навіны на СТБ.
18.30 «Прывітанне, доктар!».
18.45 «Аўтапанарама».
19.00 «Тэма дня». Планёрка ў мэрыі.
19.10 «Прэм'ер-парад. Сталічны».
19.15 «Вечарніца».
19.30 Трылер «Па следу маньяка».
21.40 «Пяты вугал».
23.00 «Навіны СТБ—24 гадзіны».
23.30 «Віртуальны свет».
23.45 Драма «Святло жанчыны».
0.30 «Начная размова з Аляксеем Лушніковым».

СЕРАДА, 14 ЛІСТАПАДА БЕЛАРУСКАЕ ТЭЛЕБАЧАННЕ

6.30, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.35 Навіны.
9.15, 17.00 «Страсці».
10.10 Здароўе.
10.35. Сад мары.
11.00, 21.45 «Чалавек мора».
12.15 Добры дзень, Беларусь.
13.00 «Цені знікаюць апоўдні». Маст. фільм. 4-я серыя.
14.15 «Скарбы сусветнай культуры» (Германія).
15.15 «Дэні, раскажы мне гісторыю». Дак. серыял.
15.25 «Усе на арбіту!». Заключная серыя.
15.40 «Маленькія Эйнштэйны».
16.10 «Пяць цудаў».
16.20 «5 х 5».
18.20 Зона Ікс.
18.30 Гадзіна прафесіянала.
18.55 Камедыйны дэтэктыў «Кілер».
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
22.35 Спорт-кур'ер.
22.45 Крымінальнае дасье.
23.10 «Сустрэча ў Траецкім» з Аляксандрам Дамарацкім.

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00 Навіны.
8.15, 18.00 «Зямля кахання».
9.15 «Наступны». 2-я серыя.
10.20 «Паскораная дапамога».
10.50 Бібліяманія.
14.15 Ці грэх — ці два.
14.35 Праграма «100%».
15.00 «Вечны кліч».
16.00 Вялікае мыццё.
17.00 Вячэрнія навіны.
17.25 Смехапанарама Яўгена Петрасяна.
19.00 «Хто хоча стаць мільянерам?».
20.00 Час.
20.35 «Наступны». 3-я серыя.
21.45 Як гэта было. Апошні паход «Адважнага». 1974 год.
21.40 Незалежнае расследаванне.
22.30 Начны «Час».
23.00 Футбол. Таварыскі матч. Зборная Латвіі — зборная Расіі. Перадача з Рыгі.

РАСІ